Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

ЦОНА НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незапатрабаваныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • 2 р. 70 к. • 6 • 4 р. — к. • 1 год • 8 р. — к. Змена адрэсу: іншагародняя — 20 к. мясцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіторнай шасьвіт тэксту — р. 50 к. За радок шапіторнай шасьвіх тэксту 1 р. — к. За радок шапіторнай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьцепныя на 50 проц. дарожай. Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. кнігу

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радочэк . . 35 к. За кожны дадатковы . . 15 • Беспрадоўж. і чарнавікам: за радочэк . . 15 • За кожны дадатковы . . 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЮЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАННЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 9 (2498) Субота, 12-га студзеня 1929 г.

На змаганьне з тэхнічнай адсталасьцю.

«Правда» ў перадавіцы пад загалоўкам «Ликвидируем нашу технико-экономическую отсталость» піша:

Развіцьцё і ўмацаваньне савецкае сыстэмы ў значнай меры залежыць ад росту і ўмацаваньня гаспадарчае базы, дзеля разьвіцьця сацыялістычнае індустрыялізацыі краю. Між тым у галіне гаспадарчага будаўніцтва, у галіне тэхніка-эканамічнай мы маем у наяўнасьці надзвычайную адсталасьць. Вось чаму задача дагнаць і перагнаць заходня-эўрапейскую капіталістычную тэхніку, ліквідаваць уласную вытворчую адсталасьць і тэхнічную неграмотнасьць зьяўляецца цэнтральнай праблемай дню. Казаў праўду т. Сталін, калі так фармуляваў у сваёй прамове на лістападаўскім пленуме нашыя задачы ў галіне найбольшага паскораньня тэмпу тэхнічнага прагрэсу: «Недарэчна было-б супакойваць слабе тым, што, паколькі адсталасьць нашага краю не намі прыдумана, а дасталася нам у спадчыну ўсёй гісторыяй нашага краю, дык мы ня можам і не павінны адказваць за яе. Гэта ня так, таварышы; раз мы прышлі да ўлады і ўзялі на сябе задачу перабудовы краю на аснове сацыялізму, дык мы адказваем і павінны адказваць за ўсё—і за кепскае, і за добрае, і якраз затым, што мы адказваем за ўсё, мы павінны ліквідаваць нашую тэхніка эканамічную адсталасьць». Мы ні ў якім выпадку не павінны зачыняць вачэй на тое, напрыклад, што калі сярэдняя прадукцыйнасьць доменных печаў (уключаючы і дапаможных рабочых) складае ў Саюзе зараз на аднаго рабочага 330 тон, дык у той-жа самы час у Амэрыцы гэтая прадукцыйнасьць складае 3.340 тон, г. зн. больш савецкай роўна ў 10 разоў; ці, напрыклад, электрычныя сталялітныя печы маюць у нашым Саюзе найбольшы разьмер у 8 тон, у той час, як у Амэрыцы яны дасягаюць 65 тон. Раўняючы вынікі машынабудаўніцтва ў Саюзе, у Нямеччыне і Злучаных Штатах, мы будзем мець наступныя суадносіны прадукцыйнасьці працы на аднаго рабочага ў марках: у Саюзе—4.016, у Нямеччыне—6.413 і ў Паўночна Амэрыканскіх Злучаных Штатах—21.806. Таксама і ў галіне магутнасьці будуемых дыгаляў: напр., нашыя заводы пакуль-што абмяжоўваюцца 3.000 конскіх сіл, у той час, як у Амэрыцы выпушчаюцца дыгалі да 15 тысяч конскіх сіл; у СССР для бавоўняна-папяровае прамысловасьці патрэбна на тысячу верацёнаў 8 чалавек і толькі на новых фабрыках лік іх дасягае да 5 і пал.—6 чал.; у Англіі-ж на тысячу верацёнаў патрэбна 3 з паловаю, а ў Амэрыцы ўсяго 3 рабочых. Ня менш востраю праблемаю зьяўляецца і праблема прамысловых кадраў. Вялізныя задачы, якія стаяць перад краем, дыктуюць нам мець новую кваліфікаваную рабочую сілу ў вялізных разьмерах, між тым нам прыходзіцца сыстэматычна сустракацца з нізкай кваліфікацыяй раней усяго новых рабочых кадраў на буйнейшых нашых заводах.

Усе гэтыя факты з усёю відавочнасьцю падкрэсьліваюць, якую вялізную увагу павінны аддаць мы фронту гаспадарчага будаўніцтва, у першую чаргу капітальнага будаўніцтва. Такая пабудова, правільнае геаграфічнае разьмяшчэньне фабрык і заводаў, належны тып іх і разьмер прадпрыемстваў—усё гэта пытаньні, якія ўяўляюць сабою вялікую зацікаўленасьць з пункту гледжаньня ліквідацыі нашае тэхнічна-эканамічнае адсталасьці.

Задачы новага будаўніцтва, гэта вялізныя ня толькі тэхнічныя, ці тэхнічна-вытворчыя, але і палітычныя задачы. Мы павінны навучыцца гутарыць на тэхнічнай мове, бо гэтая тэхнічная мова ва ўмовах будаўніцтва сацыялізму ў нашым краі ёсьць мова палітычная, ёсьць мова клясавае барацьбы пралетарыяту, ёсьць мова будаўніцтва сацыялізму. Вось чаму лёзунг—«Тэхніка ў масы»—павінен стаць баявым пралетарскім лёзунгам, ахапляючым сабою сьвядомасьць мілённых мас.

Бязумоўна, надышоў час самым сур'ёзным парадкам высунуць пытаньне аб узмацненьні зацікаўленасьці да тэхнікі і з боку нашае вёскі. Мы павінны з усёю сур'ёзнасьцю падыйсьці да праўільнага выкарыстаньня заходня-эўрапейскае практыкі. Трэба назаўсёды адмовіцца ад лёзунгаў „шапкамі закідаем", але і не падлыжні чаць перад усім заграніччым. Трэба сур'ёзна паставіць справу заходня-эўрапейскае практыкі і асабліва выкарыстаць заходня-эўрапейскія тэхнічныя сілы, паглыбляючы і пашыраючы тэхніка-вытворчую сувязь з перадавымі ў гэтых адносінах краямі.

З гэтага пункту гледжаньня нельга ня вітаць пачыну таварыства «Культура і тэхніка» ў справе арганізацыі ў Маскве „Тыдню нямецкае тэхнікі". Падвоім і патроім нашую ўвагу да задач тэхнічнае рэканструкцыі гаспадаркі СССР.

Напярэдадні польскага адказу на ноту Літвінава.

ПОЛЬШЧА НЕ ПАЧНЕ НІЯКІХ ПЕРАМОЎ З СССР ІЗАЛЯВАНА АД РУМЫНІІ.

Польшча „ня здрадзіць Румыніі".

ВЕНА, 10-1. Як паведамляюць учарайшыя румынскія газэты, румынскі ўрад атрымаў з Варшавы паведамленьне, што Польшча не распачне ніякіх перамоў з СССР на аснове ноты Літвінава бяз згоднае згоды Румыніі.

Адначасна румынскі друк зьмяшчае ноту Літвінава і падрабязна спыняецца таксама на тлумачэньнях «Известий» наконт пазіцыі Румыніі. Погляды друку ў гэтым пытаньні разыходзяцца. Прыхільныя да ўраду «Дыміноца» і «Адэвэрул» лічаць пазіцыю «Известий» прымірэнчаю. Афіцыяльныя органы зазначаюць, што СССР павінен зьвярнуцца да Румыніі з непасрэднаю прапановаю далучыцца да пратаколу Літвінава.

Савецкія прапановы і Літва.

КОЎНЯ, 10-1. Літоўскія палітычныя колы, як і раней, аддаюць шмат увагі ноце Літвінава да Польшчы. Водлуг паведамленьняў газэт, літоўскі ўрад, які ўжо падпісаў в СССР пакт аб ненападзе, ня думае падпісваць двухбаковага пратаколу з СССР, а мае на ўвазе далучыцца да польска-савецкага пратаколу.

КОЎНЯ, 10-1. „Літувос Жыніёс" у артыкуле, прысьвечаным прыезду новага латвійскага пасланьніка ў Літве Лепіша, заяўляе, што новы пасланьнік прыяжджае ў Літву ў адказны палітычны момант, у зьвязку з прапановаю Літвінава і значэньнем гэтае прапановы для прыбалтыцкіх дзяржаў. Ад упарадкаваньня гэтага пытаньня,—піша газэта,—залежыць, ажыньцёвіцца ці не ажыньцёвіцца супрацоўніцтва Прыбалтыцкіх дзяржаў.

Наведаньне Брыяна т. Даўгалеўскім.

ПАРЫЖ, 10-1. 9-га студзеня паўнамоцны прадстаўнік СССР т. Даўгалеўскі наведаўся да міністра Брыяна. У зьвязку з гэтым некаторыя газэты выказваюць думку, што пры гутарцы між Даўгалеўскім і Брыянам было закранута пытаньне наконт савецкае ноты да Польшчы.

Стук салаўіных капыт з Парыжу.

ПАРЫЖ, 10-1. «Матэн» у далейшых абмеркаваньнях ноты т. Літвінава заяўляе, што дзяржавы, якія падпісалі пакт Бэрэга, ня бачаць падстаў для савецкае ініцыятывы, бо «хутка падыходзіць зацьверджаньне пакту сенатам Злучаных Штатаў, а пасьля гэтага зацьвердзяць яго і іншыя дзяржавы». Газэта дадае: «Некаторыя колы не без падставы разглядаюць даўгыя прапановы Масквы, як спробу раскалоць прыбалтыцкія дзяржавы і адмяжаваць Румынію ад Польшчы. Эўрапейскія дзяржавы адмаўляюцца слухаць лекцыі пацыфізму ад Камінтэрну».

Гэтай самай тэме ў «Журналь» прысьвечан вялікі артыкул Сэн-Брыса, які піша: «Польшча дасьць вразумець, што застаецца салідарнаю з Румыніяй і ўсёю Прыбалтыкаю, і што адзіна магчымая камбінацыя павінна ахапіць усе дзяржавы, зацікаўленыя ў захаваньні новага палажэньня ва ўсходняй Эўропе». Нарэшце, Сэн Брыс выказвае «надзею, што Польшча возьме пад увагу агульнаэўрапейскія інтарэсы».

У Саюзных Рэспубліках

НА ПЕРАВЫБАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

КУЛАКІ ЗВАЛЬНЯЮЦЬ БАТРАКОЎ.

МАХАЧ КАЛА. У Люскурскім раёне, Дэрбэнскае акругі кулакі, у адказ на пазбаўленьне іх выбарчых правоў, звольнілі сваіх парабкоў. З гэтых парабкоў, згода пастановы Дэрбэнскага акругкому, засноўваецца сельская камуна.

ЦАРКОЎНІКІ ПАДКУПЛЯЮЦЬ БЕДНАТУ ПАДАЧКАМІ.

ВАРОНЕЖ. 10-1. Царкоўная рада вёскі Філіпейкі, Бурлінскага раёну, пакупіла хлеба і раздала яго беднаце, каб тая галасавала за кандыдатаў у сельсаветы якіх жадае царкоўная рада.

ПАЧАЛІСЯ ПЕРАВЫБАРЫ Ў КІЕЎШЧЫНЕ.

КІЕЎ, 11-І. На Кіеўшчыне распачаліся перавыбары сельсаветаў. У першы дзень перавыбараў пераабрана 12 сельсаветаў. Выбары прайшлі пры актыўным удзеле беднаты. Процант якіх выбаршчыкаў даволі значны.

ТЭРАРЫСТЫЧНЫ АКТ КУЛАКОЎ.

ПАЛТАВА, 10-1. У вёсцы Клінаўцы, Карлаўскага раёну стралям прав вакно мясцовага кулака забілі старшыню камітэту незаможных сялян Кавяке. Пракуратура распачала дазнаньне, арыштавана некалькі кулакоў.

З чым партыя Леніна ідзе на перавыбары.

ЗЬВЯЗАЦЬ НАШЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗАДАЧЫ З ШТОДЗЁННЫМІ ПАТРЭБАМІ МАС.

МАСКВА, 10-га студзеня ў Маскве адбыўся шматлюдны сход Бауманаўскага партактыву, прысьвечаны пытаньню аб перавыбарах у саветы. З дакладам выступіў намесьнік наркома РСІ т. Якаўлеў.

Мы на выбарах,—зазначыў ён,—ня можам зьвесьці ўсю справу да вузка-дзелавое праграмы (там вунь трэба паставіць ліхтар, тут паправіць каналізацыю і г. д.). Гэтыя пытаньні бясспрэчна значныя, і іх трэба ставіць на абмеркаваньне рабочых, але гэта не галоўнае. На выбарах трэба зьвязаць нашыя палітычныя задачы з штодзённымі патрэбамі працоўных мас. Трэба працоўным сказаць, якія перад намі стаяць цяжкасьці. Мы павінны сказаць адкрыта: цяжкасьці вялікія, задачы вельмі складаныя, але кожны рабочы павінен падумаць тым, як іх разьвязаць. На перавыбарчых сходах мы павінны гаварыць ня толькі пра цяжкасьці і недахопы, але і пра той вялізны рост, які мае нашае сацыялістычнае будаўніцтва (вялікі разьмер капітальнага будаўніцтва, выкананьне пляну электрыфікацыі і г. д.). Аб гэтых станоўчых фактах павінен ведаць кожны рабочы. Задачы сацыялістычнага будаўніцтва—зьніжэньне сабекошту, павялічэньне прадукцыйнасьці працы—вымагаюць ад рабочае клясы самае вялікае арганізаванасьці, актыўнасьці і працоўнае дысцыпліны. Трэба рашуча змагацца з прагуламі і п'яцтвам у працы. Нарэшце, важным момантам перавыбараў будзе самая шырокая самакрытыка,—тое аб чым Ленін казаў: «бесспартыйныя павінны крытыкаваць партыйных».

„ПЕРАКЛІЧКА ВУГАЛЮ І МЭТАЛУ".

КАШТОЎНАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ «СОВЕТСКОЙ СИБИРИ» І «УРАЛЬСКОГО РАБОЧЕГО».

НОВАСІБІРСК, 11-І. «Советская Сибирь» і «Уральский рабочий» распачынаюць урала-сібірскую пераклічку „вугалю і мэталу". Задача пераклічкі—умацаваньне гаспадарчага супрацоўніцтва Урала і Сібіру. Кожны край падасьць свой „рахунак". да абмеркаваньня якога будуць прыцягнуты шырокія рабочыя масы. Для ўдзелу ў абмеркаваньні «рахункаў» і азнаямленьні з вугольнаю прамысловасьцю Сібіру ў Сібір прыедзе делегацыя уральскіх рабочых і спэцыялістаў. На прадпрыемствах-ж мэталёвае прамысловасьці Уралу паедуць делегаты сібірскіх гарнякоў, мэталёўцаў і чыгуначнікаў.

У Кузьнецкім басэйне для гарнякоў наладжваюцца даклады аб урала кузьнецкай праблеме і гаспадарчай сувязі Сібіру з Уралам.

Каб вывіць якасьць мэталу, які ідзе на выпрацоўку сельска гаспадарчых машын. «Советская Сибирь» наладжвае абсьледаваньне сібірскіх калгасаў.

„ТЫДЗЕНЬ НЯМЕЦКАЕ ТЭХЧІКІ".

Наведаньне цагі нямецкімі гасьцямі.

МАСКВА. 10-га студзеня нямецкія прафесары наведалі Цэнтральны Аэрагідрадынамічны Інстытут імя прафэсара Жукоўскага (ЦАГІ). дзе былі спатканы дырэктарам ЦАГІ прафэсарам Чаплыгіным і супрацоўнікамі Інстытуту. Адбылася гутарка, пасьля якое супрацоўнікі ЦАГІ пазнаёмілі нямецкіх гасьцей з гісторыяй заснаваньня Інстытуту, яго задачамі і працаю. Потым госьці аглядалі памяшканьне Інстытуту. Гасьцям былі прадэманстраваны аэрасані канструкцыі ЦАГІ. Пасьля гэтага былі паказаны лябараторыі па дасьледваньні авіацыйных матар'ялаў, аэрадынамічная труба, гідраванал, адзел вятровых рухавікоў і іншыя адзіяленьні Інстытуту. Інстытут вырабіў на нямецкіх вучоных моцнае ўражаньне.

Даклады нямецкіх вучоных у 1-м МДУ.

МАСКВА, 10-1. На другі дзень «тыдню нямецкае тэхнікі» у 1-м Маскоўскім Дзяржаўным Універсытэце выступіў з дакладам на тэму аб выкарыстаньні вадзяное энергіі і разьмеркаваньні электра-энергіі прафэсар Мюльдер. У сваім вялікім дакладзе, прысьвечаным у значнай меры гісторыі і сучаснаму стану электрыфікацыі ў Нямеччыне, ён зазначыў на тую вялізную ролю, якую ў справе электрыфікацыі адыгрываюць вадзяныя крыніцы краю. Для СССР, як зазначыў ён, гэта мае асабліва важнае значэньне, бо адчыняе шырокія магчымасьці мець танную электрычную сілу.

У 1-м МДУ выступіў таксама з дакладам аб сельскай гаспадарцы Нямеччыны прафэсар Цэрнэр. Даклады прайшлі з вялікім посьпехам.

Нямецкія вучоныя запрошаны ў Харкаў

ХАРКАЎ, 11-і Усеукраінскае таварыства культурнае сувязі з заграніцаю запрасіла ў Харкаў нямецкіх вучоных, якія ў сучасны момант знаходзяцца у Маскве. Адначасна праўленьне таварыства згадзілася на запросіны нямецкіх арганізацый аб удзеле ўкраінскіх вучоных у нямецкіх часопісях, між іншым, у часопісі «Ост-Эўропа» і інш. выданьнях нямецкага таварыства вывучэньня ўсходняе Эўропы.

Украінска-турэцкае культурнае зблізжэньне.

АДЭСА, 11-І. Вярнулася дэлегацыя украінскіх літаратараў і вучоных, якія наведалі Канстантынопаль, Ангору, Сьмірну і зрабілі там шэраг дакладаў, прысьвечаных становішчу ўкраінскае літаратуры і навукі. Дэлегацыя заснавала стадую навуковую сувязь з турэцкім інстытутам, ангорскім факультэтам юрыдычных навук, канстантынопальскім універсытэтам і літаратурна-мастацкім таварыствам.

У красавіку дэлегацыя турэцкіх вучоных мяркуе прыехаць на Усеукраінскі зьезд усходазнаўцаў.

На 7-мігадзінны дзень.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 10-1. На заводах імя Пятроўскага і Леніна, у якіх налічваецца больш 20-ці тысяч рабочых, пераведзена на 7-мігадзінны працоўны дзень больш 5-ці тысяч рабочых. У зьвязку з гэтым на заводах адбыўся ўрачысты мітынг. Рабочыя атрымалі прывітаньні ад усеукраінскага савету прафсаюзаў і іншых арганізацый і паслалі прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і ЦВК СССР, усеукраінскаму савету прафсаюзаў, т. Патроўскаму і украінскаму ўраду. У прывітаньнях рабочыя заяўляюць урад і партыю, што яны выканаюць ускладзеныя на іх рэвалюцыяй і пралетарыятам абавязкі.

Растуць крыніцы прыбыткаў вёскі.

МАСКВА, 11-1. Наркамфін СССР падрахаваў папярэднія вынікі вучоту крыніц прыбыткаў па сельска-гаспадарчым падатку. Па ўсіх крыніцах прыбыткаў ёсьць значнае павялічэньне ў параўнаньні з леташнім годам. Па 33 адміністрацыйных адзінках РСФСР абшар улічанае запашкі ўзрос на 1,2 проц., па БССР—на 0,5 проц., па УССР—на 2,4 пр. Абшар улічанага засеву па тых-жа адміністрацыйных адзінках узрос: у РСФСР на 6,2 проц., БССР—на 6,9 пр., УзбССР—1,2 пр., ТуркССР—на 18 проц. Колькасьць улічанае рагатае жывёлы ўзрасла на 15,3 проц. па РСФСР, на 10,4 проц. па УССР, на 13,1 проц. па УзбССР і на 35,5 пр. па ТуркССР. Рост улічанае пахаці тлумачыцца пераважна палепшаньнем якасьці вучоту і барацьбою з утойваньнем. Значны рост буйнае рагатае жывёлы таксама тлумачыцца ня толькі натуральным ростам статку, але і палепшаньнем вучоту. Значны ўплыў на вынікі вучоту зрабілі ўпяршыню ўведзеныя штрафы за ўтойваньне крыніц прыбытку, а таксама зьніжэньне ўзросту абкладаемае буйнае рагатае жывёлы: Не зважаючы на дасягненні ў галіне вучоту, усё-ж ёсьць значны недавучот; паўстае пытаньне аб далейшым палепшаньні гэтае працы.

Ад'езд дэлегацыі гарнякоў СССР у Осло.

МАСКВА. Дэлегацыя ЦК саюзу горнарабочых у складзе т. т. Шварца і Слуцкага выехала ў Осло (Нарвэгія) на пасяджэньне расейска-шведзкага камітэту горнарабочых, якое адчыняецца 15-га студзеня. Пасьля пасяджэньня адчыніцца канфэрэнцыя прадстаўнікоў саюзаў горнарабочых СССР і Нарвэгіі, каб абмеркаваць пытаньне наконт падпісаньня узаемнага ўгавору аб дружбе і супрацоўніцтве.

Падгалоскі баеў выключаны з партыі.

КЗЫЛ-АРДА, 9-1. Краёвая кантрольная камісія за супрачаньне проці канфіскацыі маемасьці ў сваіх сваякоў баеў выключыла з партыі 4 чалавекі, у тым ліку загадчыка арганаддзелу ЦВК Казакстану Мухамэдава.

ПОЛЬШЧА ДАЛА АДКАЗ на ноту т. Літвінава.

(Атрымана а 1-ай гадзіне ўночы).

11 студзеня ў 21 гадзіну 30 мінут часова паверены ў справах Польскай рэспублікі ў Маскве пан Зелязінскі ўручыў часова выконваючаму абавязкі Народнага Камісара па Чужаземных справах т. Літвінаву адказную ноту на мірныя прапановы савецкага ўраду, зробленыя 28-га сьнежня 1928 г.

Тэкст польскай ноты і адказнай ноты Народнага Камісарыяту па Чужаземных справах будзе зьмешчаны ў чарговым нумары газэты.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

СПРАВА „ГРАМАДЫ" У АПЭЛЯЦЫЙНЫМ СУДЗЕ.

На 28 лютага г. г., як паведамляе «Дзеньнік Віленскі» (№ 8) вызначан у віл. апэляцыйным судзе разгляд скаргаў на прысуд, які быў вынесен 22 сакавіка мінулага году ў Віленскім акруговым судзе па справе «Грамады». Гэты сэнсацыйны працэс прадстаўляўся тады так: на лаве абвінавачаных сядзела 56 асоб з 4 беларускімі пасламі на чале, абвінавачаных у антыдзяржаўнай дзейсьці. Па справе было заклікана 421 сьведак з боку пракурорскай улады і звыш 200 сьведак з боку абароны. Акты справы абымалі 19 томаў.

Суд прыгаварыў: паслоў Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага, Мятлу і Валошына па 12 год астрогу, Бурсэвіча і Акіньчыца—па 8 год, 8 абвінавачаных — па 6 год, 9—па 5 год, 10—па 4 гады, 4—па 3 гады, а іншых 17—у тым ліку Астроўскага, Луцкевіча і Каўша суд апраўдаў.

На гэты прысуд былі пададзены апэляцыйныя скаргі ўсіх засуджаных, і з боку пракурорскай улады ў адносінах да апраўданых Астроўскага, Луцкевіча, Шкаркевіча, Сакалоўскага і Навакоўскага. З прычыны вялікай колькасьці матар'ялаў і выкліканьня значнага ліку сьведак, працэс у другой інстанцыі працягнецца, як думае «Дз. Віленскі», звыш тыдня. Старшынёю на судзе будзе віцэ-старшыня апэляцыйнага суду Дмахоўскі.

Працэс аб забойстве куратара Сабінскага.

29 студзеня г.г. суд прысяжных у Львове яшчэ раз разгледзіць справу прысуджаных на кару сьмерці — Атаманчука і Вярбіцкага, якія былі абвінавачаны ў забойстве куратара львоўскай школьнай акругі Сабінскага.

Палітыка ў адносінах да украінцаў.

9 студзеня г. г. ў Львове адбылася канфэрэнцыя па ўкраінскіх справах, у якой прынялі ўдзел заводы: львоўскі Галухоўскі, Дрогобыцкі—Машынскі, станіславаўскі—Накаяечнікаў і в аняскі—Юзэўскі. Апрача таго, на зьезьдзе быў кракаўскі заводка Квяцьняўскі, які праз доўгі час быў тарнопальскім заводай, і пасол сойму палкоўнік Коц, адзін з галоўных палітычных кіраўніноў „Беспартыйнага Блёку супрацоўніцтва з урадам".

На зьезьдзе разглядаліся пытаньні аб палітыцы ў адносінах да ўкраінцаў.

Камуністычны сьцяг.

З тэлефоннага слупа на Акружной вул. у Варшаве зьнят гэтымі днямі камуністычны сьцяг з надпісамі: „Прэч з фашысцкім тэрорам - работнікі, стварым самаабарону на фабрыках. Аддзел Павіцьля. Саюз камуністычнай моладзі».

Катастрофа ў капальні „Клеафас".

У капальні „Клеафас" у Залешку здарыўся гэтымі днямі нешчасьлівы выпадак. Кандуктар электрычнай чыгункі папаў пад колы вагаэткі, нагружанай вугалем, і быў задушан на сьмерць.

Чыгуначная катастрофа.

Гэтымі днямі здарылася на ст. Забжадоўцы чыгуначная катастрофа. 10 вагонаў таварнага поезду зусім разьбіты, цягнік і два вагоны значна пашкоджаны. Адзін пагранічны вартаўнік паранены.

Пажары ў Лодзінскім павеце.

У Лютаморску апошнімі часамі нова месца 14 пажараў. Гадаўна ў майятку А. Пашкоўскага згарэла стаялка з збожжам, „Газ. Варш." (№ 9) прыпушчае, што ўсе гэтыя пажары зьяўляюцца результатам дзейнасьці банды падпальшчыкаў.

Самазабойствы ў Варшаве.

Паводле статыстычных даных у мінулым годзе ў Варшаве было 1451 самазабойствам, у тым ліку—315 асоб з сьмяротным вынікам. У параўнаньні з 1927 г. самазабойстваў у 1928 г. было больш на 67.

НЯМЕЧЧЫНА НЕ АДСТУПІЦЬ АД СУПРАЦОЎНІЦТВА З СССР.

ВОДГУКІ НА ПРЫЕЗД ФОН-ДЫРКСЭНА Ў МАСКВУ.

БЭРЛІН, 11-1. Газэта «Дойчэ Тагесцэйтунг», абмяркоўваючы прамовы, сказаныя ў часе перадачы вярыцельных грамат нямецкім паслом у СССР фон-Дыркзэнам, піша:

«Той друк нэйтральных дзяржаў, які ў якасьці шчытаносца французкае прапаганды пільна сочыць за вернасьцю Нямеччыны Лёкарнскаму ўгавору, скардзіцца і заяўляе, што Нямеччына не павінна была сердзіцца за наўдачу лёкарнскае палітыкі, бо новай Антанце трэба выступаць падвойным фронтам проці СССР і Паўночна-Амэрыканскіх Злучаных Штатаў.

Уступленьне ў выкананьне абавязкаў нямецкага пасла ў Маскве, у якім з абодвых бакоў з надзвычайнаю выразнасьцю было падкрэсьлена, што Рапальскі ўгавор ня спыняе заставацца трывалай і непарушнай асновай савецка-нямецкіх дачыненьняў, уяўляе сабою выразны адказ на гэтыя фальшывыя спакусныя заявы, якія ні ў якім выпадку нельга падаваць сур'ёзнага значэньня. Зьяўляецца ўстойлівым фактам, што Масква мае для Нямеччыны вялізнае значэньне, і яна гэтае значэньне захавае. Хто спадзяецца, што Нямеччына калі-небудзь абмяняе вялізныя перавагі прыяцельскага нэйтралітэту, які гарантуе Рапальскі ўгавор, на авантуру ўдзелу ў Антанце над англа-французкім камандаваньнем, той ня ведае вопыту, які вабыла Нямеччына з свайго геаграфічнага становішча (на працягу двухсотгадовае гісторыі.

У ХАНЬКОЎ НАСЬПЯВАЮЦЬ БУЙНЫЯ ПАДЗЕІ.

АБУРЗЬНЕ ПРОЦІ ЯПОНІІ ВЫЛІВАЕЦЦА ВА ЎСЕАГУЛЬНУЮ СТАЧКУ

ШАНХАЙ, 10-І. За апошні час антыяпонскі рух у Ханькоў значна пашырыўся. Падтаваю зьявілася забойства кітайскага рыкшы японцам салдатам. Японцы адмовіліся здаволіць патрабаваньне кітайцаў запланіць сваяком забітага адшкадаваньне і пакараць вінаватага. Японцы адхілілі таксама патрабаваньне вывесьці сваіх марак ў з Ханькоў. Наміністі міністр замежных спраў паведаміў японскага консула ў Ханькоў, што, з прычыны адмовы японцаў выканаць справядлівыя патрабаваньні, кітайскі ўрад складае з сябе ўсякую адказнасьць у выпадку якіх-небудзь непаразуменьняў, накіраваных проці японскіх рэзыдэнтаў у Ханькоў.

Сярод рабочых і служачых прадпрыемстваў японскае канцэсіі ў Ханькоў ідзе агітацыя за абвяшчэньне ўсеагульнае забастоўкі. Межы канцэсіі вартуюцца японскімі вайсковымі патрулямі, якія прыпавалі нешчасьлівы кітайцаў за распаўсюджваньне агітацыйнага матар'ялу. Адначасна кожную ноч усе будынкі і вулкі японскае канцэсіі затапляюцца антыяпонскімі плякатамі.

«Чайна Прэс» паведамляе, што ў Ханькоў забаставала 10 тысяч рабочых на японскіх прадпрыемствах. Стачачкі паставілі пікеты, якія наглядаюць за парадкам на шкны канцэсіі. Кампанія за ўсеагульную забастоўку на тэрыторыі канцэсіі ня спыняецца. Водлуг некаторых неправерэных чутак, з Шанхаю ў Ханькоў паслана японская вайсковая падмога.

ЯПОНІЯ ПАСЫЛАЕ ВАЙСКОВЫЯ СУДНЫ.

ТОКІЁ, 10-1. Увесь друк паведамляе, што, з прычыны „пагражаючага становішча" у Ханькоў, японскае марское міністэрства паслала ў Ханькоў два крэйсэры з Шанхаю.

УСЕАГУЛЬНАЯ СТАЧКА ПРОЦІ БЕЛЫХ У АНГЕЛЬСКАЙ КАЛЁНІІ

ЛЁНДАН, 11-І. Водлуг паведамленьняў з Мэльбурну (Аўстралія) на выспе Рабаул, якая знаходзіцца на поўнач ад Новае Гвінеі і вызначаецца мандатнай тэрыторыяй Аўстраліі, распачалася ўсеагульная забастоўка тубыльцаў. Усе тубыльцы, якія абслугоўвалі белых, у тым ліку і паліцэйскія, кінулі працу і пакідзілі сходы, на якіх абмеркавалі пытаньне аб патрэбе павысіць заработак.

Гвалты ваеннае дыктатуры ў Югаславіі.

Разагнаны ўсе рабочыя прафарганізацыі.

ФРАНЦЫЯ І АНГЛІЯ НАМЕРАНЫ АБЯРНУЦЬ ЮГАСЛАВІЮ Ў АНТЫСАВЕЦКІ ЦЭНТР НА БАЛКАНАХ.

Зачыненьне апазіцыйных газэт.

ВЕНА, 10-1. З Белграду паведамляюць, што прэмер Жыўковіч разаслаў тэлеграфам мясцовай уладзе абежнік, у якім растлумачвае новы дэкрэт аб „абароне дзяржавы". Аднак, гэты «растлумачальны» абежнік не надае ніякае выразнасьці становішчу, бо, як відаць, сам урад яшчэ ня ведае, якім палітычным арганізацыям ён дазволіць існаваць».

Сёньня спынілі сваё існаваньне дзьве белградзкія газэты, адна радыкальная («Самаўправа») і другая дэмакратычная. Учора ў Загрэбе дэпутаты распушчанае харвацкае сялянскае партыі спрабавалі наладзіць канфэрэнцыю. Аднак, канфэрэнцыя ня была дазволена жандарамі, якія апячаталі памяшканьне, дзе яна мелася адбыцца.

Харвацкія лідэры расчараваны.

ВЕНА, 10-1. Водлуг паведамленьняў з Белграду, мерапрыемствы новага югаслаўскага ўраду і артыкулы ўрадавага друку сьведчаць, што, не зважаючы на ранейшыя заявы, кіруючыя колы спадзяюцца на доўгае існаваньне дыктатуры.

Лідэр распушчанае харвацкае сялянскае партыі Мачэк перадаў харвацкім газэтам новую заяву, у якой яшчэ раз падкрэсьліў ён ё «расчараваньне» (Мачэк у пачатку заяўляў, што ён «задаволен» пераваротам). Далей Мачэк заявіў, што ён прапанаваў каралю складзьці „апалітычны габінэт", аднак назначаны каралём урад мае зусім выразную палітычную афарбоўку. Газэты, якія агалашалі заяву Мачэка, канфіскаваны паўторна (у першы раз яны былі канфіскаваны за зьмяшчэньне ранейшае заявы Мачэка).

З прычыны таго, што, згодна югаслаўскага закону аб друку, трэцяя канфіскацыя выклікае зачыненьне газэты, апазіцыйны друк, баючыся канфіскацыі, устрымліваецца ад абмеркаваньняў у зьвязку з пераваротам

Пераварот адбыўся пры падтрымцы Францыі.

ПАРЫЖ, 10-1. Зазначаючы на нядаўні пабыт югаслаўскага караля Аляксандра ў Парыжы і на нясупынае ўзброеньне Югаславіі Францыяй, «Юманітэ» ня зьменьвае свайго погляду наконт удзелу французкага ўраду ў белградзкім перавароце. Газэта зазначае, што Францыя і Англія імкнуцца заснаваць у Югаславіі балканскі цэнтр вайсковых падрыхтовак проці СССР.

Вобыск у прафсаюзе мэталёўцаў.

ВЕНА, 10-1. З Белграду паведамляюць, што ўчынен вобыск у памяшканьні незалежнага прафсаюзу мэталёўцаў у Белградзе. Памяшканьне апячатана.

ЮГАСЛАЎСКІ ЎРАД ВЫДАЎ ЗАГАД РАСПУСЬЦІЦЬ УСЕ РАБОЧЫЯ ПРАФАРГАНІЗАЦЫІ.

САВЕЦКА-ПЭРСІДЗКАЯ ПРЫЯЗЬНЬ МАЦНЕЕ.

ТЭГЕРАН, 10-1. 9 студзеня ў паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Пэрсіі адбыўся прыём для прэсы. Прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх газэт, а таксама кіраўнікі савецкіх гаспадарчых арганізацый, разам 37 асоб. Прыём яшчэ раз паказаў, што між савецкім паўсольствам і пэрсідзкаю грамадзкасьцю існуюць прыяцельскія адносіны. З прамовамі выступілі паўнамоцны прадстаўнік СССР т. Даўцян і рэдактар газэты «Шэфаг-Сорх» Дэшты.

Ад'езд дэлегацыі гарнякоў СССР у Осло.

МАСКВА. Дэлегацыя ЦК саюзу горнарабочых у складзе т. т. Шварца і Слуцкага выехала ў Осло (Нарвэгія) на пасяджэньне расейска-шведзкага камітэту горнарабочых, якое адчыняецца 15-га студзеня. Пасьля пасяджэньня адчыніцца канфэрэнцыя прадстаўнікоў саюзаў горнарабочых СССР і Нарвэгіі, каб абмеркаваць пытаньне наконт падпісаньня узаемнага ўгавору аб дружбе і супрацоўніцтве.

Падгалоскі баеў выключаны з партыі.

КЗЫЛ-АРДА, 9-1. Краёвая кантрольная камісія за супрачаньне проці канфіскацыі маемасьці ў сваіх сваякоў баеў выключыла з партыі 4 чалавекі, у тым ліку загадчыка арганаддзелу Ц

ПЕРАВАРОТ У ЮГАСЛАВІІ.

Хранічны дзяржаўны крызіс, які разьвіваў Югаславію ў працягу 10-ці год яе існаваньня і які ў апошнія месяцы стаў пагражаць самаму існаваньню гэтай дзяржавы ў яе сучасных межах, скончыўся пакуль што ваеннай дыктатурай.

Ужо даўно гаварылі аб хуткай магчымасьці «генеральскіх урадаў» у Югаславіі. Аднак пераварот, які толькі што адбыўся зьяўляецца некаторай неспадзяванкай па сваёй надзвычайнай розкасьці. Між іншым, чакалі роспуску скупшчыны (сэрбскі парлямант) і назначэньня новых выбараў, а справа скончылася поўным скасаваньнем канстытуцыі 1921 году і агалашэньнем абсалютнай улады караля.

Трэба прызнаць, што калі некалькі дзён таму назад габінэт Карошца падаўся ў адстаўку, дык становішча начало выглядаць вельмі крытычна, бо скончылася фіяскам спроба, якая мела сваёю мэтаю выратаваць сітуацыю. Карошц, славенец, утварыў у ліпені мінулага году ўрад, складзены з розных этнічных элемэнтаў Югаславіі.

У гэтым урадзе былі, апрача сэрбскіх радыкалаў, два славенскія людоўцы, два басьнякі, два незалежныя харваты і адзін магамэтанін. Гэтак складзены ўрад меў заданьнем праводзіць часовую палітыку меншай ці большай дэцэнтралізацыі. Аднак, ураду Карошца не ўдалося спыніць заўзятай апазіцыі буржуазных харвацкіх палітыкаў, якія здолелі аб'яднаць навакол сябе харвацкае сялянства. Упартая барацьба між Белградам і Загрэбам дайшла да апагею пасьля забойства ў чэрвені мін. г. трох харвацкіх дэпутатаў скупшчыны. Пасьля гэтага харвацкія дэпутаты выйшлі з скупшчыны і пачалі прапаганду палітычнага байкоту югаслаўскіх дзяржаўных установаў і амаль ня поўнага ўнезалежненьня Харватыі ад Сэрбіі. Загрэб, па іх думцы, павінен быў-бы атрымаць уласны парлямант і сваю ўласную цывільную і вайсковую адміністрацыю. Што датычыцца іншых югаслаўскіх правінцый, як Ваяводзіна, Бачка, Далмацыя, Босьнія-Герцагавіна і Славонія, дык яны мелі-б магчымасьць выказацца ці за вунію з Сэрбіяй, ці за вунію з Харватыяй. І харваты, і славенцы, і іншыя нацыянальнасьці, якія апынуліся ў межах сучаснай Югаславіі, пратэстуюць проці крайняга цэнтралізму, які праводзіўся ў жыцьцё сэрбскімі партыямі. Гэты цэнтралізм праводзіўся як у галіне адміністрацыі, так і адносна войска, суду, дыпляматыі і нават правадаўства.

Нават некаторыя сэрбскія партыі не згаджаліся з цэнтралістычным кірункам палітыкі ў Югаславіі. Напрыклад, група Узуновіча і дэмакрата Давідовіча здавалі сабе справу, што трэба замяніць цэнтралізм аўтаналізмам паасобных тэрытарыяльна-нацыянальных груп. Толькі «радыкалы» з групы Вунічэвіча, верныя традыцыям памёршага Пашыча, не хацелі і слухаць аб вымене ўнутранага югаслаўскага ладу. Іх упартая непадпадаўнасьць не давала магчымасьці прыйсьці да якога-небудзь кампрамісу на парлямэнцкім грунце. І вось цяпер мы бачым спробу прыйсьці да якога-небудзь кампрамісу ці згоды пры дапамозе вельмі рызыкоўнага спосабу—ваеннай дыктатуры і абсалютызму вярхоўнай улады.

Скупшчына распушчана, канстытуцыя 1921 г. скасавана; замест гэтага ўведзена ваенная дыктатура і абсалютная ўлада караля. Ва ўрад прыцягнены прадстаўнікі буйнай харвацкай буржуазеі. На гэта трэба глядзець, як на спробу ўнесьці раскол сярод харвацкіх палітыкаў і разьбіць той адзіны нацыянальны фронт, які харваты процістаўлялі белградзкаму цэнтралізму. Харвацкая буржуазея мае цяпер магчымасьць удзельнічаць у кіраваньні дзяржавай і змагацца з харвацкімі нацыянальна-рэвалюцыйнымі партыямі. Адначасова ўлада адабрана ад сэрбскай радыкальнай партыі, якая карысталася ўладай у працягу некалькіх дзесяцігодзьдзяў.

У склад новага ўраду ўвайшлі: два генэралы, пяць сэрбскіх радыкалаў, два сэрбскія дэмакраты, два харваты, адзін славенец і чатыры беспартыйныя (сэрбы і харваты). Ёсьць усе даныя думаць, што такога «кампрамісу» пры складаньні новага ўраду дасягнулі ў Югаславіі пры актыўным удзеле Англіі і Францыі. Ангельскі пасол у Белградзе Кэнкор і спэцыяльна дэлегаваны ў Югаславію намесьнік старшыні камісіі французкай палаты дэпутатаў Бастыд прынялі жывы ўдзел у ліквідацыі канфлікту, які зьяўляўся перашкодай ва ўзмацненьні ваеннай магутнасьці Югаславіі. Апошняя зьяўляецца саюзьніцай Францыі, а праз англа-французкую ваенна-марскую згоду і Англіі. Саюзьнікі вельмі зацікаўлены ў ваеннай магутнасьці Югаславіі на выпадак збройнага канфлікту, галоўным чынам, з Італіяй, якая імкнецца пашырыць свае ўплывы на Балканскай паўвысьпе.

Вось гэтыя «камбінацыі» Італіі, з аднаго боку і Англіі з Францыяй—з другога боку, і зьяўляюцца сапраўднай прычынай перавароту ў Югаславіі. Спарадзіваная ў апошнія гады ўнутранымі раздорамі, Югаславія павінна пры ваеннай дыктатуры адбудаваць сваю баяздольнасьць і зноў зрабіцца надзейнай апорай англа-французскіх інтарэсаў на Балканах.

У гэтым, галоўным чынам, і заключаецца значэньне югаслаўскага перавароту.

М. А—н.

ПУАНКАРЭ УХІЛЯЕЦЦА АД АДСТАЎКІ.

ПАРЫЖ. 10-1. Афіцыйна паведамляецца, што Пуанкарэ ня будзе падаваць ў адстаўку і зьменьваць склад габінэту нават у тым выпадку, калі ўрад пасьля распачатае ў парламэнце генэральнае дыскусіі атрымае нязначную і, прытым, выключна правую большасьць.

ВОСТРЫЯ СПРЭЧКІ Ў ПАРЛЯМАНЦЕ.

ПАРЫЖ. 10-1. Агэнцтва Гаваса паведамляе: «У палаце распачалося абмеркаваньне інтэрпэляцыі аконт заежнае палітыкі. У спрэчках выступіў сацыяліст Фросар, які зганіў кампанію проці парламэнту і запракнуў урад за двухсэнсную пазыцыю пры вырашэньні пытаньня аб павялічэньні дэпутацкае пэнсіі. Вострую дыскусію выклікала пытаньне аб клерыкальнай палітыцы ўраду.

Выступіўшы ў спрэчках дэпутат Кашэн папракаў французскі капіталізм у агрэсыўнай палітыцы ў адносінах да рабочае клясы, Кашэн спрачаючыся з афіцыйнымі заявамі, што адным з прытулкаў вайны зьяўляецца Грузія, зазначае: «Абсьледаваньне ангельскіх сацыялістаў паказала, што Савецкая Грузія расквітае».

ПЯЦЬ ГАДОЎ НА СЛУЖБЕ ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

НЬЮ-ЁРК, 5-1. Сёньня 5-ыя ўгодкі з дня заснаваньня органу «Уоркерс Парты» (камуністычная партыя Злучаных Штатаў) «Дэйлі Уоркер». Выпушчан спэцыяльны нумар газэты, прысьвечаны ўгодкам. Увечары ў гарадзкім тэатры адбыўся ўрачысты сход.

Батракі заданьне партыі і ўлады выканаюць

Урачысты выпуск усебеларускіх прафкурсаў батракоў.

Недалёка ад Менску, у былым панскім маёнтку графа Чапскага «Волчковічы», дзе ўлетку члены саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых праводзяць свой адпачынак, з паловы мінулага кастрычніка з усіх куткоў Савецкай Беларусі зьехаліся 57 батракоў і батрачак-адзіночак на вучобу.

39 камсамольцаў, 5 партыйцаў, 13 непартыйных, 38 мужчын і 19 жанчын—вось склад усебеларускіх прафкурсаў батракоў.

— З пачатку думалі, што ня справімся з навукамі, а як крыху павучыліся, дык такая ахвота напала—толькі паданай—кажуць хлопцы і дзяўчата.

За тры месяцы ўпартай працы, без абмежаваньня часу, курсанты на толькі перамаглі навуку, але за гэты тэрмін правялі і вялікую грамадзкую працу з батракамі і сялянамі акаляючых вёсак і пасёлкаў.

— Мы былі цёмныя і не разумелі нават за што змагаецца камуністычная партыя і што за пітушка камсамол,—кажуць былыя непартыйныя батракі і батрачкі. Былыя таму, што да дню выпуску курсаў ніводнага непартыйнага не засталося. За час працы курсаў пераведзена з камсамолу ў кандыдаты партыі 13 чалавек, прынята ў камсамол 9 чалавек і ў кандыдаты партыі 4 чал.

10 студзеня было вялікае сьвята ня толькі для курсантаў батракоў, але і для мясцовага сялянства. У гэты дзень, дзень выпуску курсаў, з Менску чакалі прыезду прадстаўнікоў партыі, улады і прафсаюзу.

Зранку курсанты рыхтаваліся да сустрэчы гасьцей. Першымі прыехалі ў Валчковічы чырвонаармейцы падшэфнага палка з аркестрам музыкі. Не зважаючы на вялікі мароз, курсанты і сяляне арганізаванымі шэрагамі з чырвонымі сьцягамі пайшлі насустрэчу чырвоным байцам.

Некалькі слоў гарачых прывітаньняў і начале з чырвонаармейцамі калёна сустракаўшых накіравалася ў былы маёнтак.

У хуткім часе прыехалі прадстаўнікі з Менску.

Тав. Чарвякоў вітае курсантаў і сялян.

— Нас сеньня ўрад сустракае ня так, як царскі ўрад сустрэў у 1905 годзе рабочых у Ленінградзе—раздаўся бадзёры голас батрака-курсанта.

Мы паедзем у вёскі і будзем выконваць задачы партыі і ўлады па будаўніцтву сацыялізму...

— Ад 3000 сялян Падгайскага сельсавету шчырае прывітаньне нашаму ўраду. Няхай жыве кампартыя, няхай жыве Савецкая ўлада,—з падёмам кажа прадстаўнік сялян, член сельсавету.

Старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў дзякуе батракоў і сялян за прывітаньне і накіроўваецца разам з усімі ў памяшканьне.

Усебеларускага Старасту цікавіць, як жывуць курсанты, як яны вучыліся. Пераходзячы з пакою ў пакой, тав. Чарвякоў гутарыць з паасобнымі курсантамі.

— Ну як вам жылося, як вучыліся,—пытаецца тав. Чарвякоў батрачак-курсантак.

— Ды што і казаць, лепш ня прыдумаеш,—адказвае дзяўчына.—Спачатку думалі, што ня справімся з эканомгеаграфіяй, а зараз нават і процанты добра ведаем.

— Раней з цямна да цямна працавалі на кулака, былі і самі цёмныя, —дадае другая курсантка.—А зараз усе нашы сілы паложым на будаўніцтва сацыялізму.

— Як трэба нам вырабіць: набраць лепшых людзей у саветы, ці абраць? —пытаецца тав. Чарвякоў.

— Не набраць, а абраць, а каб у саветы папалі лепшыя прадстаўнікі батракоў, беднякоў і сераднякоў, трэба правесьці добра падрыхтоўчую працу,—адказваюць курсанты.

* * *

Разыходзяцца па двару. Тав. Чарвякова абступаюць сяляне. Кожнаму хочацца пагаварыць з старшынёй ураду.

Тав Чарвякоў цікавіцца ўраджаем Сяляне ахвотна апавядаюць з ім сваімі дасягненьнямі і недахопамі.

— На панскай зямлі, вось там, бачыце ў нас пасёлкі, бедната атрымала зямлю, апавядаюць сяляне.

— Цяжкавата ім яшчэ, бо пабудаваліся толькі некалькі год таму назад, але з часам стануць на ногі,—кажуць сяляне.

Цікавіцца т. Чарвякоў, як працуе школа.

— Добра працуе, але з пару тыдняў з-за холаду занятак ня было; зараз дровы падвезьлі і справа лепш.

Апавядаюць сяляне, што яны за самаабкладаньне адрамонтавалі школу, сёлета адкрылі яшчэ сабраць сродкі на скончэньне рамонту.

Сяляне выказываюць жаданьне зьвяцца з сваім старшынёй ЦВК БССР, што фатограф і робіць.

* * *

Раздаецца званок. Курсанты выбіраюцца найсьці ў мясцовы клюб на ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае выпуску курсаў.

З бадзёрым маршам аркестру музыкі, з чырвонымі сьцягамі, стройнымі шэрагамі накіроўваюцца ўсе ў клюб. У клюбе холадна,але вабіты да адказу.

— Некалькі гадоў таму назад у гэтым маёнтку сядзеў граф і прынятаў батракоў і сялян, а зараз у панскіх будынках мы выкоўваем барацьбітоў за лепшую будучыну ўсіх працоўных, адчыняючы ўрачыстае пасяджэньне, кажа прадстаўнік ЦК союзу.

Пад воплескі ўсёй залі ў прэзыдыум абіраюцца старшыня ЦВК БССР тав. Чарвякоў, загадчык аргаддзелу ЦК КП(б)Б тав. Гантман, загадчыца жаночага аддзелу ЦК КП(б)Б т. Крэмер, прадстаўнік ЦСПСБ, старшыня ЦП саюзу і прадстаўнікі курсантаў, падшэфнага палка, сельсавету, рабочых саўгасаў, Прылукі і інш.

— Выпуск курсантаў, кажа загадчык апошніх, датэрміновы.

Курсанты баяліся экзамену. Ваш экзамен будзе ў перавыбарчай кампаніі саветаў.

— Прадстаўнік ЦК КП(б)Б тав. Гантман, кажа:

— Перад курсантамі-батракамі стаяць зараз тры асноўныя задачы: усімі сіламі дапамагчы партыі, усю лепшую перадавую частку батрацтва цягнуць у камуністычную партыю, пад кіраўніцтвам кампартыі разам з беднякамі і серадняцтвам прыняць самы актыўны ўдзел у кампаніі перавыбараў саветаў: разьвіць самую энэргічную працу ў справе сацыялістычнай перабудовы нашай вёскі, нашай сельскай гаспадаркі.

Далей выступіў т. Чарвякоў.

У сваёй прамове ён абмаляваў, як жылося батрацтву ў гады царызму, як батракам жывецца зараз у буржуазных краінах, што зрабіла для батракоў камуністычная партыя.

— Слова батрак пры буржуазным урадзе было абідным, а зараз яно пачэснае... Становішча батрака значна палепшылася, але яму яшчэ вельмі цяжка жывецца ў кулака.

— Савецкая-Улада заклікае батрацтва весьці барацьбу за лепшую будучыну і адзін з крокаў да гэтага—арганізавацца ў прафсаюз.

Той актыў, што сёньня выпускаецца з курсаў, павінен дапамагчы неарганізаваным батракам - адзіночкам увайсьці ў прафсаюз.

Тав. Чарвякоў ставіць перад курсантамі некалькі задач.

Першая задача батракоў—выхоўваць думку сярод сваіх таварышоў на мясцох, што існуючыя савгасы трэба захоўваць і зрабіць прыкладам добра пастаўленай буйнай гаспадаркі.

Другая задача—павесьці самую актыўную працу за ўтварэньне новых буйных гаспадарак.

Батрак павінен ісьці ў калгас, камуну і артель і цягнуць за сабой сялян беднякоў і сераднякоў.

Ня менш важная задача—удзел курсантаў у стварэньні пралетарскіх моцных працаздольных саветаў.

Тав. Чарвякоў выказвае упэўненасьць, што праз усё новыя і новыя курсы батракоў мы ўцягнем апошніх у актыўны ўдзел па будаўніцтву сацыялізму ў нашай краіне.

Гучнымі воплескамі курсанты-батракі запэўнілі ўрад, што пастаўленыя задачы яны выканаюць з гонарам.

Далей вітаюць прадстаўнікі ЦСПСБ, аг жаналдзелу ЦК КП(б)Б, падшэфнага палка, сельсавету і райкому ЛКСМБ.

Рабочыя і работніцы савгасу «Прылукі» падносяць тав. Чарвякову вянок з калосьсяў жыта і аўса і запэўніваюць яго, што прыложаць усе сілы да падняцьця ўраджайнасьці.

Прывітаньні скончыліся.

На сцэну выходзіць батрак і батрачка—курсанты і запэўніваюць прад стаўнікоў партыі, ураду і прафсаюзаў, што з набытымі ведамі яны пойдуць у вёску будаваць новую сацыялістычную грамаду. Усе задачы выканаем... Дадзім моцны адпор кулаку ў яго жаданьні пралезьці ў саветы.

Заключная прамова старшыні ЦП саюзу т. Вайтэнка і ўрачыстае пасяджэньне скончана.

Ітак, 57 падкованых батракоў паехалі рабіць вялікую справу па перабудове вёскі на сацыялістычны лад.

Тав. Чарвякоў з сялянамі, якія прышлі вітаць партыю і ўрад.

ВЫБІРАЕМ СЕЛЬСАВЕТЫ.

Лес рук за кандыдатаў беднаты.

Па Зеляніцкаму с.-с. ужо абралі ў 5 пунктах сяброў савету. У в. Гарочыцы 12 сяброў, з іх 10 ад кандыдатаў КП(б)Б і сходу беднаты, дзе 1 сябра член ЛКСМБ, 2 партыйцы, 1 настаўнік, 1 жанчына і 2 высунутыя сходам; в. Вубалаць 6 сяброў, з іх 5 ад кандыдатаў КП(б)Б і беднаты і 1 ад сходу, з іх 1 партыец, 1 камсамолец, 1 жанчына; в. Нікупінск—1 сябра с.-с. жанчына. І лепш за ўсё ў в. Насавічах выбрана 13 сяброў па ўсе 100 проц. намечаных ячэйкай КП(б)Б і беднатой, з іх: 2 сябры КП(б)Б, 2 камсамольцы, 6 жанчын. У рэвкамісію абралі 2 настаўнікаў і аднаго селяніна.

На сходы зьяўлялася больш мінулага году, але яшчэ далёка недастаткова. Так, па в. Насавічы 240 чал, 48 проц. з агульнага ліку выбаршчыкаў, дзе жанчын 25 пр., мужчын 71 проц. Вубалаць—50 проц., Гарочыцы—40 проц. У малым зьяўленьні—віна савету, што рабілі мала выбарчых вучасткаў. Так, па в. Насавічы 1 вучастак аб'яднаў радыус у 6 кілёматраў хутароў і пасёлкаў у 510 выбаршчыкаў, якіх зьбіралі ў школу 6 па 6 матраў, дзе больш 250 ня можна зьмясьціць. Гэтаксама зьвярнуў мала ўвагі сельсавет да складаньня агульнага сьпісу. Па в. Насавічы запісана было ка 50 чалавек мёртвых, якім выпісваліся позвы. Гэтак сама былі выпісаны позвы ўсім пазбаўленым права голасу. Слабая тэхнічная падрыхтоўка трох адбілася на зьяве выбаршчыкаў.

А як-жа ў нас багатыя, мо' маўчалі? Крычалі, але іх песенка сьпета. Так, па в. Гарочыцы прыехалі кеньмі з дзяцьмі, з жонкамі, па в. Насавічы выступалі царкоўнікі і самагонщыкі.

Але бясьсільная іхняя злаба, крыкі і спробы сарваць кандыдатаў беднаты. Лес рук за таго, проці каго яны, і 5-10 рук за кандыдатаў заможных—вось яскравыя ім адказы.

Усюды прыняты вялікія наказы савету, дзе ахоплена шмат галін працы. Асаблівая ўвага школам і асьвеце, наогул паляпшэньню сельскай гаспадаркі. У дзьвюх вёсках адназгодна адмечены фэсты, «цуда» і „багаслоў". Так, прайшло ў нас «вялікае наша сьвята»—перавыбары, у правядзеньні якога значны ўдзел прынялі школы, якія пісалі і распаўсюджвалі позвы працаздольнай-вучняў, выдавалі насьценныя газэты, пісалі дэзуніці, прыбіралі памяшканьні да перавыбараў.

В. А. Сяргейчык.

Беднота перамагае.

(Ліст з Бабруйску).

Па Бабруйшчыне перавыбары сельскіх саветаў у самым разгары. Зьвесткі з перавыбарных вучасткаў сьведчаць аб тым, што перавыбары праходзяць пры вялікай клясавай барацьбе. Кулацтва стараецца парушыць бяднацка - серадняцкі саюз і прасунуць у саветы сваіх кандыдатаў, але гэта ім не ўдаецца.

Так, па Чыжэвіцкаму і Старобінскаму сельсаветах пры перавыбарах замоніцкія кандыдатуры былі правалены. Нават у Чыжэвічах гэтыя кандыдатуры праваліі жанчыны.

Тое самае мы назіралі і па Броскаму сельсавету, Бабруйскага раёну. На гледзячы на тое, што тут перад перавыбарамі кулацкія прыхаўсні ходзілі па хатах і агітавалі беднякоў не галасаваць за кандыдатуры партыйнай ячэйкі—нічога не дапамагло. Кандыдатуры партыйнай прайшлі на ўсе сто процантаў.

У вёсцы Медухаве, Глускага раёну нудалі і падкулачнікі зьявіліся на сход у коўным силазе. Для большага настрою перад сходам бо ў імі запрошан музыка сыграць весьлуху, але і весёлы настрой ім не дапамог. Ня гледзячы на тое, што нудалі на перавыбарчым сходзе крычалі не галасаваць за бяднацкія кандыдатуры, затрымлівалі рукі беднякоў—абраны былі ў савет тыя кандыдаты, якіх выставіла бедната.

Сьвіст і зык нёсься ад згрупаваўшайся кучкі гарлаванаў заможнікаў у час самых перавыбараў. Гэта так выяўляў яны сваю злосьць. А ім, як на зло, моладзь пасьля перавыбараў на радасьцях перамогі над куланамі справіла тут-жа вечарынку.

Бедната на перавыбарчых сходах актыўна адстайвае свае кандыдатуры. Яўка на перавыбарчыя сходы высокая. Так, па Слабада Гермакаўскаму сельсавету, Глускага раёну яўка абіраценьў на перавыбарчыя сходы дасягае 85 проц., па роскаму сельсавету, Бабруйска а раёну—80-90 проц. і наогул наведваньне перавыбарчых сходаў абіраценьмі хістаецца між 50 і 90 проц.

Прысутнасьць жанчын на сходах дасягае 50 60 проц Жанчыны актыўна ўдзельнічаюць у абгаварэньні кандыдатур. Сур'ёзна адно цца да выбараў. Супроць лета инага падвысіўся і ліч жанчын, абраных у савет.

У наказы абіраценьмі ўносяць шэраг важных момантаў.

Так, сяляне Малевіцкага савету ўнесьлі пункт аб электрыфікацыі вёскі, аб поўнай ачыстцы насеньня, сяляне вёскі Харамцы, Глускага раёну ўнесьлі пункт аб пабудове лазьні, электрыфікацыі і г. д.

У вдзіваючыхся перавыбарах беднота трымае цесную сувязь з партыйнымі і серадняцтвам і адчувае сябе гаспадаром становішча, даказваючы на справе, што ў перавыбарах перамога на яе баку.

А. ДАМБРОЎСКІ.

Кулакі праваліліся.

3-га студзеня 1929 г. у вёс. Паперня, Астраш.-Гарадзецкага раёну адбыўся агульны сход сялян па перавыбарах сяброў с.-савету, на якім прысутнічала 57 пр. агульнай колькасьці выбаршчыкаў.

Даведаўшыся аб сходзе, тамашні поп і кулак Лабаты (апошні лічыцца старшынёю Паперняўскага торф. таварыства) жадаючы пашкодзіць перавыбарам, у хаце папа склікалі другі асобны сход, на якім прысутнічалі запрашаныя—поп і кулак Лабаты і каля 7-8 асобных сялян.

Сход у папа прадаўжаўся вядоўга. Даведаўшыся пра гэткі, сябра выбарчай камісіі своечасова прыняў меры і на агульным сходзе ў сябры с-савету былі абраны намечаныя беднатой кандыдатуры.

Акрамя гэтага на гэтым-жа сходзе было праведзена самаабкладаньне на фальчарскі пункт.

Мінчын.

Меншчына.

ПЕРШЫЯ КРОКІ.

Магілеў, 11-І. 3-га і 4-га студзеня праведзены перавыбары сельсавету ў двох выбарчых вучастках мястэчка Княжыч.

У савет абраны тыя таварышы, якіх рэкамендавала партыйная ячэйка і кандыдатуры якіх абгаварваў сход групы беднаты.

50 проц. абраных у новы склад с.-савету—партыйцы і камсамольцы.

Абраны таксама ў савет дзьве жанчыны-сялянкі, з вясковага актыву.

Трэба зазначыць, што падкулачнікі на выбарах ня гралі аніякае ролі, бо ўвесь кулацкі элемэнт своечасова быў пазбаўлены права голасу.

Да наказу сялянства аднеслася добра, выпрацаваўшы шэраг канкрэтных мерапрыёмстваў і пажаданьняў, дзеля зьдзейсьненьня іх новым саветам.

Упаўне можна лічыць, што як партыйная, так і камсамольская ячэйкі належна падрыхтаваліся ў Княжычах да праведзімае зараз кампаніі.

ПРАВАЯ НЕБЯСЬПЕКА ВА ЎсеКП(б) І КАМІНТЭРНЕ.

(ДА ВЫНІКАЎ ЛІСТАПАДАЎСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК УсеКП(б).

Лістападаўскі пленум ЦК УсеКП(б) падагуліў вынікі тэй барацьбы, якая за апошнія месяцы адбывалася ў партыі вакол асноўных пастаноў XУ зьезду. Супроць спроб адходу ад пастаноў XУ зьезду, аб тэмпе індустрыялізацыі СССР і аб узмацненьні наступу на кулака, за рашучае правядзеньне іх у жыцьцё—вось якая была галоўная лінія работ пленуму. Пленум абмеркаваў усе асноўныя пытаньні, зьвязаныя з практычнай працай па ажыцьцяўленьню пастаноў XУ зьезду. Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі 1928-1929 году, г. зн. гадавы план сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй гаспадаркі, меры, неабходныя для хутчэйшага ўздыму адсталай сельскай гаспадаркі, увядзеньня 7-мігадзіннага рабочага дню, як асноўнай у гэтай стадыі ўмовы для больш шырокага ўцягваньня рабочых у справу індустрыялізацыі краіны, перадусім, вярбоўка рабочых і рэгуляваньне росту партыі, г. зн. такое налепшаньне яе складу, якое забясьпечыла-б выкананьне стаўшай шчыльна перад краінай і партыяй задачы хутчэйшай рэканструкцыі ўсёй гаспадаркі,—усё гэта разам узятае і зьяўляецца тымі практычнымі мерамі, без правядзеньня якіх пастановы XУ зьезду ня могуць быць у сучасны момант ажыцьцёўлены.

Уся праца пленуму праходзіла пад знакам рашучага адпору праваму ўхілу і прымірэнчым адносінам ад яго. Гэты бок працы пленуму мае для УсеКП(б) асабліва важнае значэньне. Менавіта па гэтаму пытаньню партыя в нецярплівасьцю чакала пастановы.

У сваіх пастановах пленум выступае супроць тых павархоўных поглядаў, якія прадстаўляюць правы ўхіл, які лёгка можна перамагчы, як такі ўхіл, які мог-бы быць ліквідаваны пораю сотняў рашучых рэвалюцый і некалькімі дзесяткамі выпадкаў прымірэньня так зван. «аргвыдаў».

Гэтыя погляды глыбока няправільныя, бо з правым ухілам партыі прыдзецца яшчэ праарабіць доўгую барацьбу. Ліквідацыя правага ўхілу будзе перш усяго і больш усяго загадзя вырашана сацыялістычнай рэканструкцыяй усёй гаспадаркі (у тым ліку сельскай). Пакуль яшчэ будуць заставацца мільёны прыватна-ўласьніцкіх, сялянскіх таваравырабляючых гаспадарак, стыхійна адраджаючых капіталізм, пакуль будзе заставацца ў кулакоў і нэпманаўскай буржуазеі надзея на капіталістычнае разьвіцьцё сялянскай гаспадаркі, пакуль нацяк дробнабуржуазнай стыхіі на партыю будзе заставацца моцным,—да таго часу правы ўхіл у тэй ці іншай ступені, у тэй ці іншай форме будзе ў нашай партыі зьяўляцца. Вось чаму барацьба з правым ухілам ня можа ня быць доўгай. Трацкісцкі ўхіл быў антысерадняцкім ухілам. Ён адхіляў ленінскую ідэю саюзу пралетарыяту з сялянствам. Трацкісцкі ўхіл быў і застаецца таму «гарадзкім» ухілам. Ён абапіраўся і абапіраецца на рэшткі старых клясаў (гарадзкое нэпманства, буржуазную інтэлігенцыю) і на дэклясаваныя элемэнты (вучні і рознашорстныя элемэнты, якія дэклясаваліся ў працэсе рэвалюцыі). Трацкісцкі ўхіл з яго ідэяй аварыі да ваеннага камунізму, з яго поглядам на сялянства, як на бязьлітасна эксплёатуемую ў мэтах сацыялістычнага будаўніцтва калёнію сацыялістычнай дзяржавы, ня мог мець падтрыманьня ў мырокіх пластох сялянства.

Правы ўхіл ёсьць у пераважнасьці „вясковы" ўхіл. Ён не адхіляе ленінскай ідэі саюзу пралетарыяту з сялянствам, але аб'ектыўна вядзе да таго, каб здаць кіруючую ролю ў гэтым саюзе сялянству, адступаючы, такім чынам, ад асноўнага палажэньня Леніна аб кіруючай ролі пралетарыяту ў гэтым саюзе.

Яшчэ ў 1920 годзе, побач з ўзнікшай тады „рабочай" апазіцыяй (Шляпнікаў) нарадзілася і „сялянская" апазіцыя, якая знайшла сваё выяўленьне ў прымітыўна-сялянскай форме, у Чырвонай арміі, якая высоўвала палажэньне, што «сялянства старшой брат, а пралетарыят—мянШой». Пасьля некалькіх год Нэп'у сялянская ідэя ў больш вымытанай форме знайшла сваё выяўленьне ў адхіленьні неабходнасьці індустрыялізацыі СССР на бліжэйшым этапе і ў навучаньні аб неабходнасьці яго аграрызацыі на гэтым этапе. Але і ў такой форме гэты ўхіл аказаўся надзвычайна прымітыўным, і ў сучасны момант ён маскуецца ў навучаньне аб тым, што не належыць браць вельмі шпаркі тэмп індустрыялізацыі, што ня трэба абмяжоўваць свабоду разьвіцьця кулацкае гаспадаркі, бо кулак нам вось яшчэ прыгадзіцца, нам яшчэ патрэбны кулацкі хлеб, што, нарэшце, ня трэба сьпяшацца з калгасамі і саўгасамі. Такім чынам, падтасоўваецца нічога агульнага ня маючая з ленінізмам ідэя супрацоўніцтва пралетарыяту з буржуазеяй для будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

Вось асноўная ідэя правага ўхілу ў яго «расейскай» форме, ідэя, зразумела, ня выступаючая ў гэткім шчырацынічным выглядзе.

Другая асабліваць „расейскае" формы правага ўхілу ў тым, што ён яшчэ не аформіўся нават ідэалёгічна, ня кажучы ўжо аб арганізацыйным афарміленьні. Ён перажывае яшчэ толькі першапачатковы фазіс свайго разьвіцьця.

Аднак, крыніцы правага ўхілу, як мы ўжо бачылі, куды глыбей, чымся крыніцы трацкізму.

Правы ўхіл сваімі карэньнямі ўходзіць глыбока ў вялізную гушчу 25 мільёнаў прыватнаўласьніцкіх сялянскіх гаспадарак (з якіх толькі каля 400 тысяч ў апошнія гады аб'ядналіся ў калгасы). Эканамічная кэндэнцыя правага ўхілу ёсьць індывідуалістычна-сялянскія тэндэнцыі,—тэндэнцыі яшчэ некапіталістычнага сялянства, якое стыхійна цягнулася яшчэ да капіталізму, значыцца, гэта кулацкія эканамічныя тэндэнцыі.

Канкрэтныя формы выяўленьня правага ўхілу вельмі разнастойныя. Ён выяўляецца ў розных зьвеньнях партыйнае, савецкае, прафэсыянальнае працы. Натуральна, што вялізныя дробнабуржуазныя масы аказваюць важным на ўсе праяўленьні партыйнага жыцьця. Гэты ўхіл выяўляецца і пры хлебазагатоўках, калі візавыя партыйныя, савецкія працаўнікі перашкаджаюць у інтарэсах кулакоў і заможнае часткі сераднякоў правільнаму разгортваньню гэтай працы, і ў няправільным разьмеркаваньні сельска-гаспадарчага падатку (зьніжэньне падатку з кулакоў за кошт сераднякоў), і ў няправільным разьмеркаваньні сельска-гаспадарчых машын (перадача іх кулакам), і ў чыста бытавых зьявішчах (сябраваньне камуністаў з кулакамі і нэпманамі), і ў праляваньні кулацкіх элемэнтаў у вясковыя партыйныя арганізацыі і г. д. і г. д. Незлічыма пералічыць усе віды выяўленьняў правага ўхілу ў партыйным жыцьці ЎсеКП(б).

Правы ўхіл яшчэ ня склаўся ў якую-небудзь сыстэму погляду, але асобныя элемэнты гэтай сыстэмы расеяны ўсюды. З гэтай прычыны бязьлітасная ідэалёгічная барацьба з гэтым ухілам, ня гледзячы на тое, што ён яшчэ не аформіўся ідэалёгічна, настойліва неабходна зараз-жа; неабходнасьць гэткай барацьбы пленум падкрэсьліў самым рашучым парадкам, а тым самым падкрэсьліў і поўную неабходнасьць барацьбы супроць цярпімых ці прымірэнчых адносін да правага ўхілу.

Інакшае становішча, у параўнаньні з УсеКП(б), існуе ў іншых камуністычных партыях. Гэта трэба асабліва падкрэсьліць, бо чыста мэханічнае перанясеньне пастаноў апошняга пленуму ЦК УсеКП(б), у частцы датычнай правага ўхілу, на іншыя партыі, магло-б прывесьці да поўнага скажэньня практычных задач, якія стаяць перад гэтымі партыямі ў барацьбе супроць правага ўхілу.

У першую чаргу ня трэба забываць, што ў адзнаку ад УсеКП(б) іншыя кампартыі яшчэ толькі стаяць перад задачай утварэньня сацыялістычнай разьвіцьці. А гэта задача, як мы добра ведаем па вопыту расейскай партыі, вымагае ад гэтых партый максымальнай адналькавасьці і манапольнасьці. У працягу 10-цёхгодзьдзя партыя бальшавікоў настойліва право зіла чыстку сваіх шэрагаў, а мэтаю забясьпечыць іх максымальную адналькавасьць. Без гэтай папярэдняй працы, якая выяўлялася ў доўгай настойлівай барацьбе супроць усякіх ухілаў, УсеКП(б) не змагла-б падрыхтаваць сябе да правядзеньня Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Гісторыя ўсіх іншых партый, узьнікшых пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі і вышаўшых з нетраў сацыялдэмакратычных партый, паказвае, што за гэтыя гады шляхам унутрыпартыйнай барацьбы гэтыя партыі таксама ўсё больш ачышчаліся ад сацыял-дэмакратычнага чалавечага балясту (Леві, Фросара, Бубніка і К-о), які яны прынесьлі з сабой. Зараз гэтыя партыі больш адналькавыя, чымся былі 10 год назад. Але гэты працэс далёка яшчэ ня скончан.

А між тым абвастрэньне клясавых супярэчнасьцяй і клясавай барацьбы і шпаркае набліжэньне ваеннай небясьпекі патрабуе ад гэтых партый хутчэйшага ачышчэньня ад сацыялдэмакратычных элемэнтаў, якія і зьяўляюцца асноўнымі насіцелямі правага ўхілу.

Крыніцы правых ухілаў ва УсеКП(б) і іншых партыях розныя. Розныя таксама і фазы разьвіцьця правага ўхілу ва УсеКП(б) і іншых кампартыях. У той час, як ва УсеКП(б) правы ўхіл перажывае яшчэ толькі сваю першапачатковую фазу, у іншых кампартыях правы ўхіл ужо аформіўся ня толькі ідэалёгічна, але ў некаторых і арганізацыйна. Ня трэба забываць гэтай істотнай розьніцы. Іменна яна і паказвае, што чыста мэханічнае перанясеньне пастаноў апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) на іншыя партыі магло-б прывесьці да шэрагу грубых памылак.

Агульнае-ж паміж «расейскім» правым ухілам і «міжнародным» гэта—тэндэнцыя супрацоўніцтва з буржуазеяй (у капіталістычных краінах—у форме супрацоўніцтва з рэфармістамі). Гэта тэндэнцыя выплывае з неб

ПАД АБСТРЭЛ МАС.

БЮРАКРАТЫ, САМАДУРЫ І ВАЛАКІТЧЫКІ ДАПАМАГАЮЦЬ НАШАМУ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ.

УЗМАЦНІМ АГОНЬ ПА ШКОДНІКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА.

Шэсьць гадоў валакіты.

1200 ВЁРСТ ПЕХАТОЮ ПРАЙШОЎ СЕЛЯНІН АНТОСЬ МАКАРЭВІЧ, 300 РУБЛЁЎ ПАТРАЦІЎ, А СПРАВА ЎСЁ НЕ РАЗГЛЕДЖАНА

(В. Шалягі, Самахвалаўскі р-н, Мен. акругі).

У 1923 годзе вясною алвасяльчане нашай вёскі Макарэвіч Антось і Макарэвіч Тодар паспрачаліся за сядзібу, якая раней належыла Макарэвічу Антосю.

Макарэвіч Тодар, выходзячы з сваіх уласных інтарэсаў, гэту сядзібу самавольна захапіў, пачаў будавацца і засяльць Макарэвіч Антось за самавольства і за панесеныя страты падаў на Макарэвіч у народны суд 4 вуч. Сыўшага Чэрвенскага павету.

Нарсуд перадаў гэтую справу ізеля ўстанаўленьня, чыя гэта сапраўды зямля, у ВЗК (быўш. Цэнтральскай вол.) ВЗК гэта пытаньне была разьвязала ў карысьць Тодара. Антось, будучы незадаволены гэтай пастановай, абскардзіў яе ў Мен. АЗК (1924 г.) Мен. АЗК гэта пытаньне разьвязала так, як і патрэбна было, г. з. вынесла пастанову, што сядзіба сапраўды належыць Антосю.

Тодар гэту пастанову абскардзіў у Вышэйшую Зям. Камісію (кастрычнік 1924 г.) Апошняя замацавала пастанову АЗК, але ў матывах нагаварыла шмат супярэчнасьцей.

Адказчык, выняўшы пастанову з гэтымі блытанымі матывамі, даў добрага магарыча б. старшыні Візьлянскага с-сав. т. Лагутчыку, які на падставе копіі пастановы ВЗК выканаў не пасутнасьці пастанову, а грунтуючыся на матывах пастановы ў карысьць Тодара, зрабіўшы дзеля г таго адпаведныя няправільныя дакументы.

Антось падае скаргу (верасень 1925 году) у ЦВК БССР, які гэту справу перадае да разгляду асобай калегіі па земельных справах пры НКЗ БССР (люты 1926 г.).

Калегія, дзякуючы таму, што было аркушаў 100 розных папер, ды таму, што гэтыя паперы пісаў «аўтарытэтны» Лагутчык, таксама справы не разабрала, бо гэта зрабіць надта было трудна.

Пасьля гэтага Антось (1926 г. верасень) падае скаргу на неправільнае выканаўнае пастановы АЗК т. Лагутчыкам пракур туры Менакругі, якая перадае гэту справу следчаму 5 вуч. Мен. акругі, і такім чынам пахадзіўшы, гэта справа паўтара гады ад пракурора да следчага, ды назад нарэшце згубілася—так сказалі Антосю ў пракуратуры (1927 г., красавік).

Антось падае запава скаргу—зноў пракуратуры Мен. акругі. Пракуратура дае адносіну Самахвалавіцкай РЗК аб дачы тлумачэньня па сутнасьці справы. Хоць гэта сутнасьць была добра відаць пракуратуры з адбіткаў пастаноў АЗК і г. д., якія пры заяве прыкладваліся.

У гэты час згарэў будынак Самахвалавіцкага РВК, дзе згарэла і гэта справа.

З гэтага пачынаецца новая гісторыя.

Пракурор піша ў ліпені 1928 г. зноў адносіну перасылаючы пры гэтым заяву Антося, якая падавалася пракурору Самахвалавіцкага РВК, каб гэту справу высьветліць на месцы.

Але зноў бяда. Шчысьленку, старш. РЗК, «невядома», дзе жыве Макарэвіч Антось (?!). Адрас дакладны маецца на заяве, але Шчысьленак піша адносіну Сеньніцкаму с.-сав. з запытаньнем, ці ёсьць на тэрыторыі с.-с. Макарэвіч Антось.

Адтуль бязумоўна далі адказ, што такога няма. Тады Шчысьленак на гэтым адказе ад 6-VIII—піша ў канцылярыю каб даць па ўсім с.-с. Самахвалавіцкага р. адносіну аб адшуканьні Макарэвіча Антося. Праз м-ц удалося яго знайсьці.

Па сутнасьці ягчэ РЗК нічога не зрабіла, а калі зробіць—гэта невядома.

Толькі ведама тое, што Антось зрабіў пешаходам, шукаючы правільнага разгляду справы, 1200 вёрст і патраціў 300 р. грошай.

Верас.

Скакун пабрыківае

У БАРЫСАЎСКІМ ДОМЕ СЕЛЯНІНА „НАЧАЛЬСТВА" ЗАЗНАЛАСЯ

Скакун—загадчык Дому Селяніна ў Барысаве, на Скакуна спадзяваліся, казалі, справу валадзіць.

Але-ж сяляне, замест добрага прыёму, спаткалі з боку т. Скакуна грубыя адносіны асабліва па пытаньнях аплаты тых паслуг, якімі селянін карыстаецца.

Нагледалася, што сялянам адмаўлялася ў прытулку, з прычыны адсутнічаньня некальких капеек.

Адмаўлялася ў прытулку ўсім бедным сялянам і батракам, бо яны „у лапцях" і забрудзяць пасьцельную бялізну.

Яскрава паказаў сябе «гаспадар» Скакун, калі делегацыя сялян, якая прыехала ў Барысаў для ўдзельнічаньня ў сьвяткаваньня XI гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, не атрымала прытулку ў Доме Селяніна з прычыны „НЕ ЎЗГАДНЕНЬНЯ ГЭТАГА ПЫТАНЬНЯ З АДПАВЕДНЫМІ ОРГАНАМІ".

Гэты факт яскрава сьведчыць аб фізіяноміі гэтага «прав дзіка» ідэй смычкі гораду з вёскай.

Сяляне не атрымлівалі нічога культурнага.

Лекцыі ня чыталіся, чытальня зусім ніколі не адчынялася, гучнагаварыцель—маўчыць.

А загадчык Дому Селяніна Скакун адчувае сябе сапраўдным гаспадаром дому. Атрымліваючы 108 руб. у м-ц; карыстаецца ўсімі паслугамі: яму і кватэра, і асьвятленьне, і апал; абеды, сьнеданьні і вячэра ў працягу цэлага году—дармова.

Скакун робіць з буфэту наборы і зварачвае ўсё гэтае натурай. Цікава адкуль ён бярэ гэтае:—з кладовай сваёй, ці „адкупляе".

Буфэтчыкам ён прапанаваў не рабіць запісаў аб набору з буфэту прадуктаў, а рабіць будзе «ён сам гэтае».

Адкориленага 7-мінудовага кабана прадаў ён свайму бацьку за 35 руб., а ў расьпісцы аб прадажы кабана за 35 руб. запісаны яго вес у 3 з пал. пуды.

З нотай астаўленьня сабе пласьцінак ад грамафона, якія каштавалі 45 руб., Скакун прадаў грамафон Дому Селяніна за 60 рублёў, а сабе заставіў гэтыя пласьцінкі.

Адрамантаваў ён этажорку за рахунак Дому Селяніна, а потым «адкупляе» яе за 2 рублі, у той час калі каштоўнасьць яе вышэй, да 8-10 рублёў.

Наогул аб дзейнасьці «кіраўніка» культурнага цэнтру—Барысаўшчыны нагчыма шмат гаварыць.

Паміж Скакуном і супрацоўнікамі Дому Селяніна існуюць дрэнныя ўзаемаадносіны.

У вачох Скакуна—прафупаўнаважаны калектыву, слабра партыі—Буднік—«быдла», працаўнікі «скаты».

Чамусьці працаўнікі ў працягу мінулага году не атрымлівалі па віне Скакуна спэцвопратку.

Буфэтчыкі працавалі бяз выхадных дзён у працягу году не атрымоўваючы ўзнагароды за гэта.

Усе гэтыя факты нам сьведчаць аб тым, што ў працы ДС ня ўсё добра.

Цікава, што з першага дню «панаваньня» Скакуна ня было ніводнай рэвізіі.

Неабходна тэрмінова РВК і райкому партыі аздаравіць атмасфэру каля Дому Селяніна.

І. Клібанаў.

Хрыбцэнка--былы паліцыянт--арудуе.

ПАЧАЛОСЯ З ПРАТЭКЦЫІ.

МБВ чыгунка з вясны гэтага году на ст. Вобаль пачала новае будаўніцтва. Патрабавалася шмат людзей—чорнарабочых, майстроў і людзей з адукацыяй, якія могуць пісаць, лічыць і за працай наглядаць.

Былы дарожны майстар ст. Вобаль, былы кандыдат КП(б)Б, які зараз пад савецкім сукном знаходзіцца, цёмнай памяці Якубэйт, пратэкцыю склаў: на пасаду старшага рабочага рэкамэндаваў чалавека адукаванага, практычнага, бывалага, на ўсе рукі спэца—Хрыбцэнку па прозьвішчу.

ХРЫБЦЭНКА ВЫЯЎЛЯЕЦЦА.

Дзельны чалавек перш-на-перш радні павінен паказаць, што яму, як дзельнаму чалавеку, даручана важная і з поўнымі правамі пасада.

Хрыбцэнка добра разумеў гэта і хапеў, каб яго ягчэ больш важным лічылі, а таму ў першую чаргу пачаў прымаць на працу сваіх радных братоў і сватоў, кумоў і добрых сяброў па чарцы, ці шклянцы самагону.

Выходзіла так, што за хрыбцэнкаўскай машкарой мясцовай беднаце, батраству і навэт беспрацоўным членам саюзу месца не знаходзілася.

«НЯМА МЁДУ І ГАРЭЛКІ—НЯМА І ПРАЦЫ».

Ходзіць адзін беспрацоўны, просіцца на працу—ня прымаюць. Ідзе больш заможны з суседняй вёскі, і сьмяецца беднаку: „Раз у цябе мёду няма,—цябе і ня прынялі, хоць ты і камсамолец, хоць ты і член саюзу, хоць ты—і беспрацоўны рабочы; а ў мяне ёсьць мёд—я прынят".

Другі кажа: «Прапіў з Хрыбцэнкам пяць рублёў, але заўтра працаваць буду».

Праз мёд, гарэлку, хабары розныя, пападалі на працу заможныя сяляне. Беднякі глядзе... даць не маглі.

ПАЧАЛІ ПРАПАДАЦЬ ДНІ.

Дзесяткі крыўд ад рабочых, што дні не запісваюцца. У некаторых—наадварот: не працуюць, а дні запісваюцца, але... Гэта радня Хрыбцэнкі.

На 300 рабочых, якія за сэзон працавалі, было выдадзена 30 разьлікавых кніжак, у якіх адзначана, калі разьлік—і ўсё: запісаў няма ніякіх.

ХРЫБЦЭНКА І МІКАЛАЕЎ АРГАНІЗОЎВАЮЦЬ «ГАРЭМ».

Чалавек, пабыўшы паліцэйскім, на вайне царскай насіўшы пагоны афіцэра, Хрыбцэнка добра знаём і з самай абрынутай формай распусты. Разам з дзесятнікам Мікалаевым ён па свой бок перацягвае вартаўніц вадакачкі Котаву і З, куцяць з імі, прымушаюць перад імі крыўляцца ў касьцюмах міфічнага праайца Адама.

Котава—іх сябра, спэкулянтка і гандляр водкай, а З.—ахвяра, якую трэба ратаваць.

СУМНЫЯ ВЫНІКІ.

Хрыбцэнка, разгульны чалавек, шырокая паліцэйская натура, удалы прадстаўнік народы дзяржыморд (з 4-х братоў—3 былі паліцэйскімі) рашыў адзначыць сябе больш выразна, лепш паказаць свае, уласьцівыя толькі крывавай паліцыі, здольнасьці.

Уноч, калі дзяжурыла каля вадакачкі вартаўніца С., ён хацеў яе згвалціць. С. апярэдзіла, на яе з боку Хрыбцэнка і Мікалаева было гаменьне, і апошні паступак яскрава паказаў, што тут мае месца выпадак паганай справы антысэмітызму.

Справай зацікавіліся прафарганізацыі, РСІ, АДПУ, партарганізацыі. Пастановай рабочкому Хрыбцэнка з саюзу выключан і з працы звольнен. Чакаем, калі ён сядзе на лаўку падсудных.

А. М-кі.

Алексейчук і Гіндзін--„цьвёрдыя" людзі.

(Ліст з Шклова).

Старшыня сельска-гаспадарчага таварыства ў Шклове—тав. Алексейчук—чалавек вельмі рашучы і цьвёрды:

— Я перацягну ўсіх працаўнікоў з Белдзяржгандлю, я ім дам большыя аклады, але ня дам ім магчымасьці весьці загатоўку.

Як сказаў, так і зрабіў. Адпойчы Алексейчук падазваў да сябе працаўніка Шклоўскага пункту Белдзяржгандлю тав Гіндзіна і сказаў:

— Паслухай, дарагі, у цябе жонка, дзеці, якал axвота табе служыць у «чырвоных кунцоў», гэтых «чужаземцаў», вось у нас канцэрацыя, за намі будучыня, вось табе на 20 руб. больш і хадзі да нас, ты чалавек сумленны, ведаеш усіх карабейнікаў, прасолаў, з табой разам да нас пяройдзе ўся армія карабейнікаў.

І Гіндзін пашоў працаваць у сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства. Сваю дзейнасьць пачаў з перамоў з карабейнікамі:

— Навошта вам працаць у Белдзяржгандлі, вы лепш пераходзьце да нас, вы нам будзеце дастаўляць рыбьё, косьці, галёшы і іншую такую дрэбязь, а мы вам замест гэтага дамо хусткі, ніткі, у нас канцэрацыя, у нашых руках усё.

І цэлы шэраг карабейнікаў (ня гаслячы на тое, што ў іх былі дагаворы з Белдзяржгандлем) павезьлі свае тавары с.-г. таварыству.

Пача ся поўны зрыў работы. Умяшаўся ў гэту справу Шклоўскі райком, саюз савгандлькслужачых, і апошніі была дадзена старшыні с.-г. т-ва дырэктыва зьняць Гіндзіна з працы і спыніць канкурэнцыю.

Слова гэта адно, а справа—гэта другое. Указаньне шклоўскіх органаў, іх дырэктыва ляжала недзе пад сукном, і ў выніку, пакуль дырэктыва райкому папала ў рукі Алексейчука—было перахоплена 11 карабейнікаў. Рэшта карабейнікі пад уплывам Гіндзіна (гэта іх стары прыяцель) паступова пераходзілі ў с.-г. таварыства.

Паміж с.-г. таварыствам і Белдзяржгандлем пачалася склока, справа дашла да бойкі, і нарэшце, праз месяц райком паўтарыў сваю катэгарычную пастанову аб звальненьні Гіндзіна. Але і гэта „катэгарычная" пастанова райкому вось ужо ў працягу 2-х тыдняў у жыцьцё не праводзіцца. Гіндзін зусім безсаромна перацягвае да сябе карабейнікаў, загатоўка другарадных відаў экспарту зрываецца, бо замест загатовак увесь час ня спыняюцца бойкі і сваркі паміж Гіндзіным, карабейнікамі і Белдзяржгандлем.

Акруговыя сяляне, якія частаўляюць другарадныя віды экспарту, нічога ня могуць зразумець, бо з аднаго боку іх цягне Гіндзін, а з другога агенты Белдзяржгандлю, і ў выніку задураныя сяляне аддаюць свой тавар прыватніку, які пацяшаецца з гэтых боек і карыстаючыся імі скупляе тавар сам.

Гэткае становішча цягнецца ўжо звыш 6 тыдняў. Пастанова райкому аказалася кавалкам паперы, саюз ня прыняў тых рашучых мер для зьліквідаваньня гэтых нездаровых зьявішчаў і з кожным днём узрастаючай канкурэнцыі.

Неабходны самыя энэргічныя, самыя рашучыя меры для зьнішчэньня гэтага зла.

Л. Манін.

„Надзвычайна цьвёрдалобыя".

Сяляне вёскі Гарочычы перакананіся, што жыць паасобнымі гаспадаркамі цяжка і 14 гаспадароў парашылі арганізаваць калектыў на сваіх землях. Сяляне, як і сьлецце, падалі заяву куды належыць і думалі, што яны хутка стануць калектывістымі, але нажаль адной заявы было мала і прышлося ягчэ дабавіць хаджэньні ад аднаго начальніка да другога.

У канцы-канцоў дабіліся таго, што выехаў загадчык Калінкавіцкага земаддзелу паначыць і паздаровацца з калектывістамі. Прыехаў, пабачыў і паздароваўся і паехаў сабе дадому, а калектывісты зноў пашлі абіваць парогі і дабіліся зноў-такі з трудом што ім далі статут. Статут прынялі, а хадзілі, калі ёсьць статут, дык арганізацыя ўжо паўная.

Цяпер пытаньне ўпёрлася ў адвод зямлі і вось ужо два месяцы хадзілі будучыя калектывісты і нічога не дабіліся і кажуць: «Надзвычайна цьвёрдалобыя нашы райвыканкомаўцы, а асабліва цьвёрды загадчык земаддзелу тав. Карняевец—як вол украінскі; то яму холадна, то ў зямлямераў пальчатак няма і адцягваў, адцягваў, а цяпер і саўсім на вясну адкладае».

Сяляне думалі, што калі ім зараз адвядуць зямлю, дык яны за зіму нешта перавяцуць на новае месца, вывязуць увіжку гной і агулам за зіму падрыхтуюцца, а вясной возьмуцца будаваць калектыў. Хадзілі, хадзілі сяляне, а сёньня расказваюць мне свае хаджэньні і кажуць: «Не, мабыць, не арганізуем мы калектыву, бо Калінкавіцкі РВК штосьці ня хоча, а падгрунтае, вельмі-ж цяжка ўсё гэта зрабіць».

Я прачытаў і растлумачыў сялянам словы тав. Гамарніка, сказаныя ў дакладзе на пленуме ЦК КП(б)Б па пытаньню сельскай гаспадаркі і паабяцаў запісаць допіс у газэту і сяляне-калектывісты зноў падбадзёрыліся і пашлі да дому абнадзейнымі, што калектыў будзе.

«Савецкая Беларусь», памажы ім!

Васіль.

Мазыршчына.

„Я загадваю--не размаўляць"!

Вельмі добры гаспадар—старшыня Горацкага райвыканкому, Аршанскай акругі. Паспрабуем даказаць прыкладамі і фактамі.

Трэба старшыні РВК Жылінку наехаць на райён „па справе неадкладнай важнасьці".

— Дзе ўзяць каня?

— Свайго? Шкода. Хай гадуецца.

— Даць загад сялянам—«прадставіць-жа зараз каня».—Не часы вайсковага камунізму.

— Ага...—зьявілася думка.—У нас-жа ёсьць пажарная дружына.

Праз некалькі часу брандмайстар пажа дружыны часаў патэлефаніраваў:

— Гора... ня ведаю, што рабіць. Начальства загадвае—трэба падначальвацца.

Каня даюць. Такім-жа манэрам каня даюць у другі раз, трэці, чацьверты, дзесяты.

Цярпілівасьць вечнай ня бывае. «Мы доўга цярпелі, цярпець больш ня будзем»—парашылі пажарнікі.

Накіраваліся з «дыпляматычнымі» перамовамі да старшыні райвыканкому.

— Трэба зьлітавацца, таварыш старшыня. У вас-жа свае коні ёсьць. А што тады будзе, калі здарыцца пажар, а пажарныя коні будуць на райёне?

— Зьлітавацца? — запытаў хмура старшыня.

— Я загадваю, не размаўляць! Я гаспадар райёну, пагэтаму трэба мне і падначальвацца.

Вельмі было-б добра, каб хто небудзь «загадаў» старшыні РВК спыніць злоўжываньні сваімі «мудрымі загадваньнямі».

Бачыўшы.

ЧЫРВОНАЯ ВАРТА.

Агляд Чырвонай казармы.

Агляд Чырвонае казармы праводзіцца, як масавая грамадзка-палітычная кампанія, у якой павінны ўзяць удзел ня толькі Чырвоная армія, але і рабочая клясе і савецкая грамадзкасьць.

Галоўная задача агляду—прыцягнуць грамадзкую ўвагу і самадзейнасьць чырвонаармейцаў да ўтварэньня чыстае, сьветлае, утульнае і пісьменнае казармы да барацьбы з брудам, несвайнасьцю, няпісьменнасьцю, п'янствам і іншымі бытавымі недахопамі, да барацьбы з бюракратызмам, кепскімі адносінамі да чырвонаармейцаў.

Такім чынам, агляд зьяўляецца ня толькі праверкай і адшуканьнем мэтадаў палепшаньня бытавых і культурных умоў жыцьця і вучобы Чырвонае арміі, але разам з тым барацьбой за культурнага байца, за новага чалавека.

Чырвоная армія дала краіне тысячы каштоўных арганізатараў і будаўнікоў сацыялізму і гэта здарылася таму, што яна зьяўляецца баявой вайскова-палітычнай школай, дзе выкоўваюцца ня толькі моцныя загартаваныя байцы, але і энэргічныя, разьвітыя, адданыя савецкай уладзе працаўнікі.

Гэтая роля Чырвонае арміі даволі вялізная. Але яна магла-б быць большай, калі-б гаспадарчыя, бытавыя і культурныя ўмовы вучобы чырвонаармейца былі лепшымі, чымся да гэтага часу, калі-б самі чырвонаармейцы больш настойліва і актыўна ўзяліся за выкараненьне рэшткаў старога быту.

Агляд Чырвонае казармы і павінен скончыць доўгую, павольную, няпрыкметную барацьбу чырвонаармейцаў і начкладу з некультурнасьцю і з усімі гаспадарчымі і бытавымі перашкодамі.

Зразумела, што агляд Чырвонае казармы павінен выклікаць дружны і гарачы водгук з боку ўсіх рабочых і грамадзкіх арганізацый.

Ад савецкае грамадзкасьці патрабуецца ня толькі садзейнічаньне ў правядзеньні гэтае кампаніі, але і пасільная дапамога.

Патрабуецца і матар'яльная дапамога для рамонту казармаў, водпуску кватэр начскладу запасу і інш.

Рабочыя і грамадзкія арганізацыі, якія шэфствуюць над вайсковымі часьцямі, павінны прысьці на дапамогу, галоўным чынам, за ўтварэньні культурных умоў казарменнага быту, у абсталяваньні ленінскіх куткоў, радыёфікацыі і інш.

Агляд павінен паказаць чырвонаармейцам і ўсім працоўным значэньне Чырвонае казармы, як баявое і культурна-палітычнае школы маладых рабочых і сялян. Ён павінен ягчэ больш умацаваць шчыльную неаслабную сувязь Чырвонае арміі з рабочай клясай, ажыўіць і палепшыць працу шэфаў. Агляд скончыцца агульным сьвяткаваньнем адзінаццатае гадавіны Чырвонае арміі.

Першыя дні агляду Чырвонае казармы паказалі высокую актыўнасьць і масавую ініцыятыву з боку чырвонаармейцаў. Адчыняюцца чайныя, радыёфікуюцца казармы, абсталёўваюцца сталовыя, упрыгожываюцца ленінскія куткі і інш.

Акруговыя і ротныя газэты перапоўнены дзелавымі прапановамі байцоў.

Нажаль, гэтага нельга сказаць пра савецкую грамадзкасьць, якая раскачваецца пакуль што павольна. Неабходна гэту раск чку паскорыць і ўцягнуць у кампанію агляду шырокія масы рабочых.

У сваім звароце да перавыбараў у саветы ЦК УсеКП(б) заклікае партыю і працоўных «пільна сачыць за сваімі граніцамі і ўсямерна ўмацоўваць нашу Чырвоную армію, якая стаіць на варце гэтых граніц».

Агляд Чырвонае казармы павінен дапамагчы выканаць гэтую вялікую і важную задачу.

Н. Л.

ПАД РУНАК ЧЫРВОНААРМЕЙЦАМ ДА 10-ГОДЗЬДЗЯ БССР.

Палітычная Управа Беларускай Вайсковай акругі зрабіла падарунак чырвонаармейцам нашае акругі: яна выпусьціла газэту «Чырвонаармейская Праўда» на беларускай мове, як дадатак да газэты «Красноармейская Правда». Дадатак будзе выходзіць 2 разы на тыдзень.

Мы можам ужо зрабіць некаторую ацэнку газэты, бо вышаў 2-гі нумар яе.

Першы нумар—сьвяточны, вышаў 30 студзеня 1928 г. Ён зьмяшчае прывітаньні таварышоў: Калініна, Варашылава, Галадзеда, Ягорава (кам. войск БВА), Палітуправы БВА. У ім-жа зьмешчан ліст т. Бухарына; таксама зьмешчана адозва ЦК КП(б)Б.

Ужо ў першым нумары маюцца вайскораўскія заметкі. У гэтым-жа нумары закранута пытаньне аб выбарах у саветы.

У газэце № 1 выступта пытаньне: «на якой мове друкаваць газэту»?

Адзін таварыш кажа, што трэба друкаваць заметкі на ўсіх мовах (беларускай, расейскай, яўрэйскай, польскай, татарскай); другі кажа наадварот—толькі пабеларуску. Газэце трэба будзе гэта пытаньне абгаварыць і высьветліць, каб здаволіць запатрабаваньні ўсіх чырвонаармейцаў акругі.

Што тычыцца другога нумару, (які вышаў 8 студзеня с. г.), дык ён ужо мае больш мясцовага, бытавога матар'ялу.

Вельмі добра робіць радакцыя, калі друкуе невялікія карэспанденцыі.

Наогул трэба сказаць, што першае ўражаньне ад газэты—добрае. Газэтай павінны зацікавіцца ўсе чырвонаармейцы.

Леопал.

ДАП. ЫЗЫЎНІКІ Ў ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ.

Дапрызыўнікі на Смалявіцкім пункце пачалася з 26 лістапада 1928 году. Амаль усе дапрызыўнікі 1907 г. нараджэньня зьявіліся на вучобу. Пры пункце камсамольская група дапамагае партыйцам у працы.

Ячэйкі Мопр і ТДАвіяхім добра працуюць і завербавалі шмат новых членаў.

У ленкутку працуюць гурткі: палітычны, вайсковы, сельска-гаспадарчы і вайскораўскі.

Вылучаны парт'ячэйкай каманзір навербаваў 100 падпісчыкаў на газэты. Па ініцыятыве вайскораўскага гуртка выпушчаны 2 насьценгазэты.

Дрэнна толькі, што за ўвесь час праведзена толькі 2 вечары. Кіно зусім ня бачым.

У кампаніі па перавыбарах у сельсаветы праведзен на дапрызыўнуцкім мітынг-пераклічка. Дапрызыўнікі будуць адпушчаны для ўдзелу ў перавыбарах па сваіх вёсках.

Б. Марк.

Дрэнна стаіць выхаваўчая праца.

У Расьнянскім райёне Аршанскай акругі маецца 14 ячэек асоавіяхіму, якія аб'ядналі на 1-X 28 году 373 сяброў. Павялічэньне супроць мінулага году на 150 проц.

У час «Тыдню Абароны» ячэйкай сабрана каля 150 рублёў грошай, з якіх 30 процантаў засталося для ўзмацненьня працы. Зараз сабрана на пабудову школьнага самалёту сярод вучняў да 30 рублёў.

Дрэнна толькі з выхаваўчай працай. Калі раней існавала па райёну 10 розных гурткоў, дык зараз іх шмат менш. Чырвоны Крыж не дапамагае арганізацыі гурткоў першай дапамогі.

Хаця некаторыя ячэйкі працуюць лепш: Доўгавіцкая ячэйка за кароткі час папоўнілася 42 новымі сябрамі, ліквідавала сваю запазычанасьць і правяла ўжо 2 разы заняткі гуртка. Трэба толькі 4 другім ячэйкам лепш узяцца за працу, тады яна дасьць добрыя вынікі.

Н. Афанасьеў.

Пачалі добра, а зараз кепска.

(Чабатоўскі с.-с., Уварав. р., Гомельшчына).

У 1927 годзе пры Чабатоўскай хаце-чытальні арганізавалася ячэйка ТДАвіяхіму у ліку 15 чалавек. З пачатку яна працавала добра але за апошні час ня было ніводнага сходу ячэйкі. Нават некаторыя сябры ячэйкі не плацілі сяброўскіх узносаў за 8-9 месяцаў.

Авіяхімаўцы працуюць.

(М. Тураў, Мазырск. акругі).

Наш атрад Асоавіяхіму складаецца з гэткіх каманд: 1) хімікаў, 2) стралкоў, 3) наблюдацеляў, 4) сьвязістаў і 5) чырвонага крыжу. Усяго—120 чалавек.

Мы маем шмат цікавых препаратаў, розныя табліцы.

Ёсьць і бібліятэчка вайсковага выместу.

Трэба сказаць, што сябры атраду вельмі старанна адносяцца да працы: дзяжурацъ; вывучаюць вайсковыя веды; знаёмяць таксама і насельніцтва з вайсковымі ведамі.

Авіахімавец.

На дапрызыўным пункце.

Жлобінскі дапрызыўпункт пачаў працаваць з 26 лістападу мінулага году. Адносіны начсклада да дапрызыўнікаў добрыя.

Пры вучпункце арганізавана школа для малапісьменных дапрызыўнікаў. Выдаецца насьценгазэта. Працуе ленкуток. Дапрызыўнікі кажуць: „Па сканчэньні вучобы будзем дома на вёсцы праводзіць прапаганду за вывучэньне вайсковых ведаў сярод насельніцтва".

А—у.

Забылі пра ваенізацыю.

На Круглянщчыне (Аршанскай акругі) вайсковая праца амаль адсутнічае.

Улетку працаваў гурток. Камсамольцамі быў наладжан паход у м. Бялынічы. Але на гэтым і спыніліся.

Ячэйка ТДАвіяхіму, якая налічвае ў сваіх шэрагах каля 160 чал., сьпіць.

М. Дзергачоў.

Байцы рыхтуюцца.

Сваю працу Круглянскі вучэбны пункт (Аршанчына) распачаў з лістапада месяца. 130 вясковых хлапцоў Круглянщчыны ліквідуюць сваю вайсковую і палітычную няпісьменнасьць. Усе жывуць разам у казарме.

Між узводамі праводзяцца спаборніцтвы па стральбе. Ёсьць і найлепшыя стралкі.

На сходах ужо абгаварвалася пытаньне і аб выпісцы газэт, але пакуль што падпіска ідзе слаба.

Для дапрызыўнікаў урач чытае лекцыі. У працы вучпункту скарыстаў увесь пераменны склад рэйёну і чырвонаармейцы адпускнікі.

Міх.

Нічога ня робяць.

Пры Берасьцейскай школе сялянскай моладзі, Аршанскай акругі, дзе сябрамі ячэйкі Асоавіяхіму зьяўляюцца ўсе вучні—нічога ня робяць. Трэба працу разгарнуць.

Палкін.

ЗА ПАШЫРЭНЬНЕ АСУШАЛЬНАЙ МЭЛІАРАЦЫІ.

У БССР прыпадае ў сярэднім на адну гаспадарку 8,5 гэкт. карыснай зямлі і 3,4 гэкт. балотнай глебы. Пры існуючым становішчы (агрыкультурная адсталасьць, аграрная перанаселенасьць і забалочанасьць глебы) мы маем на беларускіх палёх наступную сярэднюю (за 1924-25 г.) ураджайнасьць с.-г. расьлін: жыта азімага—46,5 п., жыта яравога—37,4 пуд., пшаніцы азімай—53 пуд., пшаніцы яравой—47,2 пуд., аўса—53,3 пуд., ячменю—49,3 пуд., бульбы—554.

Па сутнасьці справы паказаныя ўраджаі вельмі мізэрныя, але калі ўзяць пад увагу тое, што нашы глебы ў большасьці пясчаныя, вельмі моцна забалочаныя і што ў беларускія глебы, для падтрыманьня іх ураджайнасьці, уносіцца кожны год толькі 306 пуд. гною (у пераводзе ўсіх відаў угнаеньня на гной) на 1 гэкт. карыснай зямлі, дык прыдзецца дзівацца глебе і за гэткія ўраджаі.

Але ня гледзячы на ўсе нашы нядбайныя адносіны да падвышэньня ўраджайнасьці мінэральных глеб, мы ня можам задаволіцца вышэйпаказанымі ўраджаямі с.-г. расьлін нашых палеткаў. Тым больш, што цяпер ужо ўсім вядома, што БССР мае вялікія прыродныя магчымасьці для атрыманьня значна большых ураджаяў, чымся іншыя рэспублікі СССР. Гэта ужо прызнана і не патрабуе ніякіх доказаў.

Спынімся толькі на пытаньні, што можа даць урэгуляваньне воднага рэжыму беларускіх глеб наогул і ў прыватнасьці асушэньне балотных глеб.

Папершае, кожная сялянская гаспадарка атрымае ў сярэднім 3,4 гэкт. дадатковай карыснай зямлі, з якой магчыма будзе атрымліваць наступную сярэднюю ўраджайнасьць с.-г. расьлін на 1 гэкт.: жыта азімага—91,5 пуд., аўса—109 пуд., ячменю—9,8 п., бульбы—972 пуд., турнэпсу—2696 пуд., моркавы кармавой—1694 пуд., бручкі сталовай—1820 пуд., капусты—1664 пуды, каюшыны з цімафеўкай—308 пудоў.

Пададзеныя лічбы ўраджайнасьці паказваюць, што ўраджай с.-г. расьлін на асушаных тарфяніках у некалькі разоў больш, чымся на мінэральных глебах. Эканамічны аналіз рэнтабельнасьці с.-г. расьлін і наогул інтэнсіўнай культуры балот, які зроблен Менскай Балотнай Станцыяй і Навукова-Дасьледчым Інстытутам імя Леніна, паказаў, што інтэнсіўная культура балот вельмі рэнтабельная.

Сельская гаспадарка БССР прымае напрамак жывёлагадоўча-збожжавай сыстэмы гаспадаркі, а пагэтаму мэліараваныя тарфяніки будуць скарыстоўвацца ў большасьці выпадкаў пад штучныя сенажаці і выпасы.

А калі гэта так, дык цікава ведаць, наколькі-ж падвысіцца ўраджайнасьць мінэральных глеб ад укоснага ўплыву эксплёатацыі мэліараванага тарфяніка? Калі будзе 3,4 гэкт. занята штучнымі сенажацямі, дык гэта дасьць нам 5855 гэкт. крахмальных эквівалентаў кожны год, чаго хопіць для пракармленьня 4 дадатковых галоў буйнай жывёлы, ад якой магчыма атрымаць 2000 пудоў дадатковага гною.

Такім чынам, гаспадарка будзе мець у сярэднім ня 3,6 гал.,*) а 7,6 гал. і гною ня 2600 пуд., а 4600 пуд. на гаспадарку.

Мая ўласная практыка ў сельскай гаспадарцы паказала, што, ужываючы торф на подсьціл і асабліва ў летні перыяд, калі ён добра і хутка перагнівае ў хляве, колькасьць гною ў сялянскай гаспадарцы можна павялічыць нават больш, як у два разы, і прыгэтым гной атрымліваецца вельмі высокай якасьці. Такім чынам, мы маглі-б мець ад 7,6 галоў буйнай жывёлы, пасьля грунтоўнай мэліарацыі і ўжываньня торфу на подсьціл, 9200 пуд. гною на адну гаспадарку. Павялічэньне на 6600 пудоў на 1 гаспадарку, альбо 776 пудоў кожны год на 1 гэкт. мінэральнай глебы. Калі лічыць атрыманы гной сярэдняй якасьці, то ў перакладзе на харчовыя матэрыі атрымаем наступную колькасьць іх: азоту—4,65 пуд., калія 5,82 пуд., фосфарнай кіслаты—2,33 пуд.

Калі мы цяпер зробім параўнаньне гэтай колькасьці харчовых матэрый з тэй колькасьцю харчовых матэрый, якую ўжывае Менская Балотная Станцыя (5,5 пуд. калія і 3,8 пуд. фосфарнай кіслаты) для атрыманьня сваіх падвойных і патройных ураджаяў у параўнаньні з мінэральнымі глебамі, дык убачым, што дадатковыя харчовыя матэрыі, атрыманыя ў выніку грунтоўнай мэліарацыі і ўжываньня торфу на ўгнаеньне, дадуць нам поўную магчымасьць падвоіць і патроіць ураджаі нашых мінэральных глеб.

Калі беларускае сялянства ўвесь век пакутавала ад балотных багн, дык цяпер яно можа бачыць росквіт сваёй будучыні толькі ў гэтых-жа балотах, якія трэба ператварыць у культурныя сенажаці, выпасы, палі і агароды праз грунтоўную асушальную мэліарацыю і праз гэта падначаліць водны рэжым беларускіх глеб чалавеку.

Мэліарацыя ў БССР з кожным годам усё больш і больш пашыраецца. На гэта ўзяты рашучы курс як дзяржавай, так і працоўнымі сялянамі. Ня тое мы бачым у торфападсьцілачным пытаньні. Тут нічога яшчэ ня зроблена. А сяляне хоць і трымаюць у большасьці выпадкаў жывёлу для атрыманьня гною, але яны амаль што ня ведаюць, як гэта павялічыць колькасьць гною без адначасовага павялічэньня жывёлы. Праўда, яны ведаюць, што калі добра падсьцілаць жывёле, дык гною будзе больш, але дзе знайсьці подсьціл, яны ня ведаюць, а сена і саломы, як вядома, не хапае і на корм. У лесе зграбаць лёт і іглы на подсьціл? Не заўседы лясьніцтва дазволіць і ня ўсюды ёсьць побач лес, а пра торф мала ведаюць, дый балота не асушана, нельга яго дастаць. Некаторыя гаспадары спрабую

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулу 123 Кодэксу Законаў аб Працы БССР.

На падставе артыкулу 2 пастановы III Сесіі ЦВК БССР IУ скликаньня за 26 ліпеня 1923 г. „Аб парадку ўнесеньня зьмен у кодэксы, зацьверджаныя ЦВК БССР" (З. З. БССР 1923 г. № 13—14, арт. 115). Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць зьмясьціць артыкул 123 Кодэксу Законаў аб Працы ў наступнай рэдакцыі:

«Арт. 123. Колькасьць вучняў ва ўстановах і прадпрыёмствах ня можа быць менш за норму, устаноўленую асобным законам».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

29 сьнежня 1928 г.

г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении от. 123 Кодекса Законов о Труде БССР.

На основании ст. 2 постановления III Сессии ЦИК БССР IУ-го созыва от 26 июля 1923 г. О порядке внесения изменений в кодексы утвержденные ЦИК БССР», (С.У. БССР 1923 г. № 13—14 ст. 115) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изложить ст. 123 Кодекса Законов о Труде в следующей редакции:

«Ст. 123. Количество учащихся в учреждениях и предприятиях не может быть меньше нормы, установленных специальным законом».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

29 декабря 1928 года.

г. Минск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне Грамадзянскага Кодэксу артыкуламі 71-а, 80-а і 363-а.

На падставе пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР „Пра меры заахвочваньня будаўніцтва жыльля за кошт прыватнага капіталу" (З. З. Саюзу ССР 1928 г., № 26, арт. 231, № 42, арт. 379 і № 60, арт. 545) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

Дапоўніць Грамадзянскі Кодэкс артыкуламі 71-а, 80-а і 363-а наступнага зьместу:

„71-а. Для будаўніцтва дамоў з плошчаю больш 200 мётраў, пры ўмове, калі гандлёвыя, складскія і іншыя нежылыя памяшканьні займаюць ня больш 1/4 плошчы гэтых дамоў, дагаворы забудоўкі заключаюцца на 60 гадоў для драўляных і на 80 гадоў для мураваных (пагельных і жалезабетонных) і мешаных будынкаў".

«80-а. Права забудоўкі на плошчы, адведзеныя для будаўніцтва прадугледжаных у арт. 71-а дамоў, можа адчужацца і адставацца ў заставу без асобнага дазволу ў выпадках, калі забудоўшчык выканаў на менш 30 проц. будаўніцтва, з дазволу органу, які даў плян пад забудоўку,—у іншых выпадках. Дазвол на патрабуецца на заставу права забудоўкі ў крэдытных установах для атрыманьня мятаюе пазычкі на будаўніцтва, на адчужэньне права забудоўкі ў прымусовым парадку па претэнзіях дзяржаўных устаноў і прадпрыёмстваў, кааперацыйных арганізацый ці крэдытных устаноў, якія далі забудоўшчыку пазычку пад заставу права забудоўкі, а таксама на далейшае адчужэньне права забудоўкі наменнёнымі ўстановамі, прадпрыёмствамі і арганізацыямі, набыўшымі права забудоўкі в публічных таргоў».

„363 а. Статуты акцыйных таварыстваў, прадугледжаных артыкулам 362, калі мятай іх зьяўляецца будаўніцтва жылых дамоў плошчай ня менш 200 квадр. мётраў у тым ліку ня больш 1/4 плошчы над гандлёвыя, складскія і іншыя нежылыя памяшканьні), зацьверджаюцца не пазьней, як праз адзін месяц ад дня падачы статуту на зацьверджаньне:

1) акруговым выканаўчым камітэтам, калі акцыйнае таварыства дзейнічае на тэрыторыі на больш адной акругі;

2) Эканамічнай Нарадай—на ўсіх іншых выпадках".

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

29 сьнежня 1928 г., г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о дополнении Гражданского Кодекса статьями 71-а, 80-а і 363-а.

На основании постановлений Совета Народных Комиссаров Союза ССР «О мерах поощрения строительства жилищ за счет частного капитала» (С. З. СССР 1928 г., № 26, ст. 231, № 42, ст. 379 и № 60, ст. 545) Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

Дополнить Гражданский Кодекс статьями 71-а, 80-а и 363-а следующего содержания:

«71-а Для строительства домов с площадью больше 200 метров, при условии, чтобы торговые, складские и другие нежилые помещения занимали не больше 1/4 площади этих домов, договоры застройки заключаются на 60 лет для деревянных и на 80 лет для каменных (кирпичных и железо-бетонных) и смешанных построек».

„80-а. Право застройки на площади, предоставленной для строительства предусмотренных в ст. 71-а домов, может отчуждаться и закладываться без особого разрешения в случаях, когда застройщик выполнил не менее 30 проц. строительства, и с согласия органа предоставившего участок под постройку,—в других случаях. Разрешение не требуется на залог права застройки в кредитных учреждениях для получения целевой ссуды на строительство, на отчуждение права застройки в принудительном порядке по претензиям государственных учреждений и предприятий, кооперативных организаций или кредитных учреждений, выдавших застройщику ссуду под залог права застройки, а также на дальнейшее отчуждение права застройки названными учреждениями, предприятиями и организациями, получившими права застройки с публичных торгов».

« 363 а. Уставы акционерных обществ, предусмотренных статьей 362, когда целью их является строительство жилых домов площадью не меньше 200 кв. метров (в том числе не больше 1/4 площади под торговые, складские и другие нежилые помещения), утверждаются не позже одного месяца со дня подачи устава на утверждение».

1) окружным исполнительным комитетом, когда акционерное общество действует на территории не больше одного округа;

2) Экономическим Совещанием—во всех остальных случаях».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

29 декабря 1928 г. г., Минск.

ХРОНІКА.

НА БАРАЦЬБУ З ДЗІЦЯЧАЙ БЯСПРЫТУЛЬНАСЬЦЮ.

(Пленум цэнтральнай дзіцячай камісіі).

10-га студзеня распачаўся пленум цэнтральнай дзіцячай камісіі пры ЦВК БССР. У працах пленуму прымае ўдзел усебеларускі стараста тав. А. Р. Чарвякоў.

На першым пасяджэньні т. Будзін зрабіў справаздачу аб дзейнасьці прэзыдыуму цэнтральнай дзіцячай камісіі. Дакладчык спыніўся на тым, што ў вёсках, мястэчках і гарадох БССР ёсьць шмат бездаглядных і напалабяспрытульных дзяцей, сірат і наогул дзяцей беднаты.

Дакладчык зварачвае ўвагу пленуму на тое, што ня ўсе ведамствы і ўстановы аддаюць належную ўвагу справе барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю. Ня гледзячы на пастанову ЦК КП(б)Б аб мерах барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю, ніводная ўстанова на мае канкрэтнага пляну выкананьня гэтай пастановы.

За мінулы год прэзыдыум цэнтральнай дзіцячай камісіі выдаткаваў на розныя мерапрыёмствы па палепшэньню жыцьця дзяцей 407.236 руб. Гэтыя сродкі пашлі, галоўным чынам, на новае будаўніцтва ва Усебеларускай дзіцячай калоніі ў Магілеве, дзе пабудаваны: школы, памяшканьне пад майстэрні, вадапавод, закуплен трактар, закончана абора і г. д.

Цэнтральная дзіцячай і акруговымі камісіямі і г-вамі «прыхільнікі дзяцей» абслужана ў 1927-28 г. каля 1000 дзяцей. Выдаткі на абслугоўваньне дзяцей за мінулы год усіх камісій дасягнулі 823.330 руб., што дае павялічэньне на 62 проц. у параўнаньні з 1926-27.

У спрэчках па дакладу т. Будзіна выступілі т. т. Якубчык, Мальковіч, Казачкоў, Фрумкін і інш. Усе прамоўцы скардзяцца на тое, што на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю некаторыя ўстановы зварачваюць мала ўвагі.

Прадстаўнік Аршанчыны скардзіўся на тое, што ў Амсьціслаўскім дзіцячым гарадку чамусьці трымаюць дзяцей-інвалідаў, якія ня могуць кравуцца з месца.

Прамоўцы падкрэсьлілі, што ў дзіцячых дамах трэба назначыць до раквалёфікаваных настаўнікаў, а дзіцячым камісіям трэба даць больш шырокае поле дзейнасьці.

Да пабудовы хэмічна-тэхналёгічнай лябараторыі.

З вясны наступнага году Беларускі Навукова-Дасьледчы Інстытут Сельскай і Лясной Гаспадаркі мяркуе пабудаваць пры Цэнтральнай Бульбяной Станцыі хэміка-тэхналёгічную лябараторыю. Лябараторыя гэта будзе вывучаць розныя спосабы тэхнічнай пераапрацоўкі бульбы.

Лябараторыя таксама будзе весьці досьледы па новаму тэхнічнаму скарыстаньню сьпірытусу, напрыклад, ужываньне сьпірытусу замест бэнзіну ў аўтамабільнай справе і ў авіацыі.

Пытаньне аб пабудове хэміка тэхналёгічнай лябараторыі разглядалася ў Навукова-Тэхнічным Савеце ВСНГ СССР, дзе атрымана цалкам станоўчае вырашэньне.

Зараз праэкт пабудовы канчаткова разглядаецца ў СНК БССР.

Пабудова лябараторыі абыйдзецца ў 21.0000 руб.

Буйныя калгасы на балоце.

На адведзеным вучастку ў 4000 гэктараў на калфондзе Мар'іна Бабруйскай акругі для калгасаў і пасялковых таварыстваў—праўленьне Белкалгассаюзу пастанавіла: арганізаваць адзін буйны калгас на плошчы ў 1000 гэктараў.

У якасьці арганізатара гэтага калгасу паслаць на сталую працу члена праўленьня Белкалгассаюза тав. Залескага.

Адначасова прыступіць да арганізацыі на гэтым фондзе калгасаў з плошчаю ня менш як на 400 гэктараў.

Склад сяброў у гэтыя калгасы будзе набірацца з тых округ, дзе маецца большая перанаселенасьць і гаспадарка вядзецца больш інтэнсыўна.

Праца гэта будзе праводзіцца праз акруговыя саюзы калгасаў, зямельныя органы і камітэты сялянскае ўзаемадапамогі з шырокім асьвятленьнем у друку.

Практычныя праблемы школьнага краязнаўства.

Пытаньні школьнага краязнаўства ў сучасны момант могуць і павінны ад стадыі добрых пажаданьняў і акадэмічных спрачак перайсьці да практычнай працы школы. Асноўныя моманты школьнай працы—дасьледчы метад, экскурсіі, прапоўныя працы, грамадзка-карысная праца—усё гэта можа служыць мэтай школьнага краязнаўства. Школьна-краязнаўчыя задачы школы павінны быць разьмеркаваны па галох навучаньня адпаведна комплексных тэм. Побач з гэтым школьна-краязнаўчыя гурткі ў парадку пазашкольнай працы павінны працаваць асобныя заданьні краязнаўчага характару па паўнай праграме. Краязнаўчая праца школы павінна быць сістэматызавана і падлічана, каб вынікі яе маглі быць (у форме дасьледчыкаў, архіваў і інш.) дапаможнікамі для школы. Такі падлік і сыстэматызацыя будуць разам з тым садзейнічаць выяўленьню грамадзка-карыснай працы школы і заснаваньню шчыльнай сувязі з насельніцтвам.

Сацыяльна-чужды элемэнт выключан з БДУ.

За апошні час выключаны з правагаду БДУ 10 чал., якія пры праверцы аказаліся дзяцьмі кулакоў, гандляроў і былых аб шарнікаў. Сярод выключаных выяўлен быў шы абшарнік Доўгі, з маёнтку Гаўхавіча, Брагінскага раёну, Гомельскай акругі і Тэолін—дачка лесапрамысловца.

За парушэньне калдагавору—да судовай адказнасьці.

У Цэнтральнае праўленьне саюзу сувязі паступіў матар'ял аб сыстэматычным парушэньні калдагавору, галоўным чынам, на ахове працы ў Рагачоўскім аддзяленьні сувязі. ЦП саюзу пастанавіла зьвяць загадчыка аддзяленьня тав. Цімашэнка з працы.

Апрача гэтага прэзыдыум ЦП саюзу ўзьняў пытаньне аб перадачы тав. Цімашэнкі пад суд за парушэньне калдагавору.

Барацьба с беспрацоўем.

За апошнія два месяцы Менскай біржы працы накіраваны на работу 193 чал.

Зараз біржа працы заключыла мэтаг дагавораў з фабрыкамі і заводамі аб пасылцы на працу беспрацоўных. Да сакавіка месяца згодна дагавораў мяркуецца паслаць каля 800 чал.

Беспрацоўныя сябры саюзу сакгандальслужачых, якія ня маюць перспэктывы на атрыманьне працы, будуць накіраваны на перакваліфікацыю.

Кватэры для рабочых.

На бягучы год фонд кватэрнага будаўніцтва па саюзу швейнікаў складае 425.000 руб.

Будзе прыступлена да пабудовы ў Віцебску „дому швейнікаў", каштоўнасьцю ў 300.000 руб.

На будаўніцтва новых кватэр на Менску будзе таксама адпушчана звыш 100000 р.

Збор старой паперы.

Менскі акругком ЛКСМБ пастанавіў распачаць кампанію па збору старой паперы (макулатуры).

Збор будзе праводзіцца па ўстановах камсамольскімі ячэйкамі.

На вёсцы камсамольцамі будзе перагледжана ягодная літаратура, а таксама архівы. Апрача гэтага, збор старай паперы будзе праводзіцца сярод саміх камсамольцаў.

Шанарскім арганізацыям дадзены таксама ўказаньні аб зборы старай паперы.

Падрыхтоўка да агляду Чырвонай казармы.

Менскі акругком ЛКСМБ выпрацаваў мэтаг мерапрыёмстваў па ўзьелу камсамолу ў агляде Чырвонай казармы. У працэсу агляду будуць арганізаваны вечары камсамольцаў з чырвонаармейцамі. Усім ячэйкам ЛКСМБ запрапанавана ў бліжэйшы час наладзіць масавыя выхады ў казармы, з мэтай агляду становішча казармы і побыту чырвонаармейцаў. Апрача гэтага, пастаноўлена зьвярнуцца да літаратурнага аб'яднаньня Бел. АПН і прафсуры аб аказаньні дапамогі ў час агляду.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦСПСБ

На шырокае абгаварэньне.

Прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў даклад НК РСІ аб абсьледаньні становішча пераваліфікацыі рабочых у прамысловасьці БССР.

Прэзыдыум пастанавіў запрапанаваць усім цэнтральным праўленьням абгаварыць на сваіх пасяджэньнях праект рэзалюцыі, запрапанаваны НК РСІ. Побач з гэтым пасталенка просіць Наркамасьветы, Наркомпрацы і ВСНГ БССР таксама абгаварыць гэты праект. Усе матар'ялы будуць заўчаткова разгледжаны на бліжэйшым пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ.

Канфэрэнцыя па барацьбе з алкагалізмам.

Прэзыдыум ЦСПСБ вырашыў на 26 студзеня склікаць Менскую гарадзкую канфэрэнцыю па барацьбе з алкагалізмам. Цэнтральным праўленьням саюзаў і фабзавмясцкомам запрапанаваць садзейнічаць хутчэйшай арганізацыі ячэек таварыства па барацьбе з алкагалізмам на тых прадпрыёмствах і ўстановах, дзе іх яшчэ няма.

Вылучэньне рабочых у Выставачны Камітэт.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў вылучыць 2 рабочых у Галоўны Выставачны Камітэт і ў усебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. У камітэт вылучаны рабочы абутковай фабрыкі т. Бугель і рабочы „Эльсоду" т. Грынкевіч.

Да арганізацыі курсаў па ахове працы.

На адным з сваіх пасяджэньняў прэзыдыум ЦСПСБ вырашыў арганізаваць курсы па ахове працы і тэхніцы бясьпечнасьці. ВСНГБ не згадзіўся, каб курсы працавалі ў рабочы час і ўнёс прапанову аб арганізацыі вячэрніх курсаў.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыум ЦСПСБ перагледзіў сваю пастанову і вырашыў арганізаваць замест дзённых вячэрнія курсы. На курсы будуць выкліканы члены фабрычна-заводзкіх камісій па ахове працы.

Мерапрыёмствы да палепшаньня часопісу «Прафрух».

На апошнім пасяджэньні прэзыдыум ЦСПСБ абгаварыў даклад рэдактара часопісу «Прафрух».

Прэзыдыум адзначыў шэраг недахопаў у веданьні часопісу, даў практычныя ўказаньні для палепшаньня часопісу. Побач з гэтым пастаноўлена ў бліжэйшае наўгодзьдзе тыраж часопісу давесьці да 6000 экз., для чаго зарэгістраваць ўсім ЦП і АПБ правесьці выкананьне дырэктыў 2-га пленуму ЦСПСБ на гэтаму пытаньню.

Сярод паляўнічых БССР.

Збор сродкаў на самалёт «Паляўнічы Беларусі».

Збор сродкаў на пабудову самалёту „Паляўнічы Беларусі" праходзіць па БССР здавальняюча. Да гэтага часу ўжо сабрана каля 9.000 руб.

Лепш праходзіць кампанія па збору сродкаў на пабудову самалёту па Менскай і Гомельскай акругах.

Збор сродкаў на пабудову самалёту мяркуецца закончыць да II-й гадавіны існаваньня Рабоча-Сялянскай Чырвонай армі (23-га лютага).

Аблавы на ваўкоў.

У сучасны момант на БССР абдываюцца аблавы на ваўкоў.

Нязаўна была праведзена аблава на ваўкоў у Койданаўскім раёне (Менчына).

Фізкультура і спорт.

Масавыя фізкультурныя гульні.

Дзярж. друкарня наладжвае 13 студзеня масавыя фізкультурныя гульні на катку «Прафінтэрна». На катку будзе праведзена калектыўнае катаньне на лыжах, каньках і санях.

У Менску 4 каткі.

У Менску да сучаснага моманту ўжо арганізавана 4 каткі.

З гэтай колькасьці 2 каткі арганізаваны ў саюзе «Прафінтэрна», адзін у садзе клюбу «Кім» і адзін—каля былога вакзалу МБВ.

На ўсіх катках ёсьць неабходныя спартыўныя прылады.

Падрыхтоўка да ўсесаюзнага перапісу дробнай прамысловасьці.

У Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР заканчваецца падрыхтоўчая праца да ўсесаюзнага перапісу дробнай прамысловасьці.

Ужо складзены сьпісы дробных прадпрыёстваў і асоб, занятых дробнай прамысловасьцю.

10-га студзеня пры Цэнтральнай Статыстычнай Управе БССР адбылася нарада з акруговымі працаўнікамі для абмеркаваньня арганізацыйнага пляну і інструкцыі па правядзеньню перапісу. Так ж-ж нарады адбудуцца ў акругах з раённымі працаўнікамі.

Перапіс пачнецца 1-га лютага і працягнецца да 15-га сакавіка г. г.

Перапісам будзе ахоплена ўся нязанятая прамысловасьць (прамысловыя ўстановы з лікам рабочых менш 16-ці пры рухавіку і менш 30-ці без рухавіка), рамесьнікі ўсіх гарадоў і сельскіх мясцовасьцяй і тыя асобы, для якіх прамысловыя вагіткі не зьяўляюцца сродкамі іх існаваньня.

Як праходзіць кампанія „зімовае дапамогі".

(Менская акруга).

Кампанія „Зімовае дапамогі" па Менскай акр., у параўнаньні з мінулымі гадамі, праходзіць слаба, на гледзячы на тое, што цэлым шарагам ячэек заданьне выканана на 100 процантаў і вышэй.

З 250 гарадзкіх ячэек да гэтага часу кампанію правялі толькі 60; з 18 вясковых райкомаў кампанію разгарнулі толькі 11.

Усяго на сёньняшні дзень сабрана ў гораде 3.000 р., ці 50 проц. заданьня, па вясковых РК паступіла 1.500 р.—15 проц.

По гораду праведзена 50 дакладаў аб становішчы палітзьняволеных у буржуазных астрогах.

Зусім слаба праходзіць кампанія ў Фрунзеўскім райкоме.

Да гэтага часу сабрана па кампаніі—1.056 р. 54 к. Разгарнулі кампанію толькі 17 ячэек.

Зусім слаба разгорнута кампанія „Зімовае дапамогі" ў вясковых райкомах; шмат якія райкомы нічога па кампаніі не зрабілі, напр., Бярэзінскі, Бягомльскі, Барысаўскі (гарадзкі), Халопеніцкі і інш. районы. Напрыклад, Барысаўскі РК, якому дадзена зад ньне сабраць 1.200 р., сабраў—35 р., Койданаўскі (заданьне 800 р.)—сабраў 130 р., Барысаў (сельскі)—заданьне 300 р.—сабраў 67 р., Пухавічы—300, сабрана—80 р., Капыль—300, сабрана—25 р.

Гэтыя лічбы гаворяць аб тым, што вясковыя РК нічога не рабілі. Вясковым РК трэба скарыстаць астатні час для таго, каб поўнасьцю выканаць заданьне, ускладненае на іх акругкомам, асабліва гэта датычыцца тых райкомаў, дзе аб'ектыўныя абставіны даюць магчымасьць гэтую працу разгарнуць, а іменна—Барысаў (горад), Капыль, Гроск, Уша, Пухавічы, Койданава і інш.

Таксама трэба падцягнуцца наступным гарадзкім ячэйкам: заводу „Бальшавік", шклозав. „Пралетары", шчотачнай фабрыкі, зав. „Беларусь", Мех швею, яч. ЦВК і інш.

Трэба сказаць, што МОПР'аўскія масы на месцах спаткалі кампанію прыхільна, аб гэтым гаворыць той факт, што некаторыя ячэйкі выканалі заданьне на 200-300 проц.

Характэрным момантам у правядзеньні кампаніі зьяўляецца тое, што кампанія праводзіцца сіламі саміх МОПР'аўскіх ячэек.

Ёсьць выпадкі, калі з боку фабзавмясцкому ня толькі няма дапамогі, а яны нават парашкаджаюць працу ячэек.

На шчотачнай фабрыцы, напр., старшыня фабзавкому не дазволіў дакладчыку-палітэмігранту зрабіць даклад аб станоўчы палітзьняволеных у буржуазных астрогах і гэтым сарваў працу ячэйкі.

П. К.

„БАЛЬШАВІК" ПРЫСТУПАЕ ПЕРШЫМ ДА АГЛЯДУ ВЫТВОРЧЫХ КАМІСІЙ.

НК РСІ вызначыла аднаго супрацоўніка для правядзеньня агляду на гарбарні „Бальшавік" (Менск).

Агляд павінен тэрмінова скончыцца, каб іншыя прадпрыёмствы скарысталі вопыт „Бальшавіка".

На гарбарні «Бальшавік» адбыўся ўжо сход актыву па пытаньню аб агляде вытворчых камісій. 9 студзеня адбылося другое па гэтаму пытаньню пасяджэньне завкому і вызначана аглядавая камісія.

У склад камісіі ўводзяцца прадстаўнікі ад вытворчай камісіі, завкому, партячэйкі, адміністрацыі, тэхнічнага кіраўніцтва, ад рабочых, рабкораў і ад РСІ.

«Рабочае вока»—друкаваная газэта заводу—ужо распачала кампанію. У хуткім часе выйдзе спэцыяльны нумар гэтай газэты, прысьвечаны агляду в дадатках «Зварот да рабочых» аб задачах, мэтах і парадку агляду. Да дадатку будзе прыкладзен чысты ліст, на якім рабочыя будуць даваць свае заўвагі і пажаданьні па працы вытворчых камісій.

С—ль.

ШАХМАТЫ № 2 (147).

Пад рэдакцыяй А. А. Каспэрскага.

Задача № 2 М. А. ГАБРЫЛОВІЧА—Менск;



Бел. Кр f2, Лd1, Лh6, Сb3, Се5, Кd7, Кh4 п. п. е4, f4 (9).

Чорн. Кр е3, Лb4, Лс6, Сс7, Сf1, Ке7, Ке8 п. с3 (8).

Мат у 2 хады.

Партыя іграна ў чампіянаце Менску 4 студзеня 1929 г.

Бел. Гаўві, чор. А. Каспэрскі.

1. е2-е4 с7-с6, 2. d2-d4 d7-d5, 3. е4:d5 с6:d5, 4. Сf1-d3 Кb8-с6, 5. с2-с3 Кg8-f6, 6. h2-h3 е7-е6, 7. Кg1-f3 Сf8-d6, 8. 0—0 Фd8-с7, 9. Лf1-е1 Се8-d7, 10. Кb1-d2 0—0—0, 11. Фd1-е2 Кf6-е5, 12. Кd2-f1 Кb5-f4, 13. Сс1:f4 Сd6:f4, 14. К3-е5 Кс6:е5, 15. d4:е5 f7-f6, 16. е5:f6 g7:f6, 17. Сd3-b5 Сd7-b5, 18 Фе2:b5 Лd8-d6, 19. Фb5-а4 Лd6-а6, 20. Фа4-d4 (f4-е5, 21. Фd4-d3 Кр с8-b8, 22. Кf1-е3 f6-f5, 23. Ке3-с2 Лh8-g8, 24. Фd3-е3 (е5-d6, 25. Кс2-d4 Лg8-g6, 26. Кр g1 h1 (d6-е5 27. Кd4-b5 Сс5:е3, 28. Кb5:с7 Кр b8-с7, 29. Ле1:е3 Кр с7-d6, 30. f3-f4 Ла6-а4, 31. b2-b4 а7-а5, 32. а2-а3 а5:b4, 33. а3:b4 Ла4-а6, 34. Ла1-е1? лепей было Лс1, 34... Ла6-с6 35. g2-g4? f5:g4, 36. h3:g4 Лс6-с4! 37. Ле3-f3 Лg6:g4, 38. f4-f5 е6-е5, 39. f5-f6 Лс4-f4, 40. Лf3-h3 Лg4-h4, 41. Лh3:h4 Л 4:h4+, 42. Кр h1-g2 h7-h5, 43. а3-а4? Лh4:b4, 44. f6-f7 Лb4-g4+ 45. Кр g2-h3 Лg4-f4 белыя здаліся.

Шахматны чампіянат Менску.

У чаньвертым туры выйгралі: Біндлес—у Н. Майсяя, Кейлес—у Гаўхберга, Мазэль—у Кузьмінскага, А. Каспэрскі—у Гаўві і Капельсон—у Хіжэроніча, ня скончыў Шукевіч з Насьцяновым (адкладзена з перавагай у Шукевіча). Становішча пасьля 4-га туру:

1) І. Мазэль+4 з 4-х, 2) Шукевіч+2 з 2-х і А. Каспэрскі+2 з 2-х.

У гарбароў.

На скуразводзе „Бальшавік" пачаліся шахматна шашачныя турніры пры ўдзеле 35 ігракоў. У хуткім часе будзе разыграна сярод гарбароў чампіянат Менску.

У бліжэйшыя дні менскія гарбары выяжджаюць у Барысаў і Віцебск, дзе згуляюць матчы з гарбарамі гэтых гарадоў.

Паведамлеьне НК Працы

НКПБ паведамляе, што 21 студзеня г. г. зьяўляецца нерабочым днём толькі для тых служачых, для якіх 26-га сьнежня 1928 г. зьяўлялася нерабочым днём, і якія ў гэты дзень (26-XII) працавалі.

Рабочыя, якія працавалі ў асобны дзень адпачынку 26-XII—гэты дзень пераносіцца на ня-небудзь іншы дзень, паводле пастаноў іх агульных сходаў.

22-I—зьяўляецца дня ўсіх нерабочым днём.

Сакратар НКПБ Круглік.

Паштовая скрынка.

— А. Случанскаму „Даволі таптаціна на месцы", І. К.—«Дзе нашы ўхілы». „Сакрат"—Аб С.-Г. Акадэміі і Падарожны—„Ня добрыя чуткі"—ня пойдзе, бо няма адрасу і прозьвішчаў аўтараў.

— Н.—Аб абсьледаваньні мясцкому Магілеўск. цэнтральнай раб. амбуляторы, Мін. С.—«В гостях у бойцов»—друкавацца ня будзе.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня 12-I—а 8-й гадз. увечары працуюць гурткі ячэйкі КП(б)Б Працаўсьветы на вывучэньню пастаноў VI-га Кангрэсу Камінтэрну.

Яўка—абавязкова.

— Сёньня вечар пытаньняў і адказаў аб працы МЦРК, пасьля кіно «Шакала Рамата"; пач. 8 г. ўв. Ув. па клюб. саюзн. кніжках.

У нядзелю 13-I а 12 г. дня дзіцячае кіно «Маленькія і вялікія». Уваход па чл. і саюзных кніжках.

Вечарам а 8 г. вечар Беларускай Акадэміі Навук, з удзелам Ігнатоўскага і інш. Пасьля выдзікі канцэрт, ув. па сябр. кніж.

Адчынен запіс у літаратурна дасьледчую групу пад кіраўн. Тэпіна.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

СУБОТА, 12-га СТУДЗЕНЯ

Зьезду чыгуначнікаў

„ЗАПЯЮЦЬ ВЕРАЦЁНЫ"

Пачатак а 8-й гадз. увечары.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Амэрыканскі баявік „ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА" Звыш праграмы—ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 46.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 8-га студзеня „БЯЗЬБІЛЕТНЫ ПАСАЖЫР". з удзелам ОСІ ОСВАЛЬД.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. Вячэрнія сэансы для дарослых „УДАЛЫ СКОК" камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка «Совкіно» № 60.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). Дзіцячы фільм вытворчасьці «Белдзяржкіно». „ЖЫВЫЯ ДАМЫ" у 5 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка „Совкіно" № 61. Штодзень 2 сэансы: 3 з пал. і 5 гадз. Цана білета 15 к.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 8 студзеня „ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ" камэдыя ў 6 частках з удзелам ІГАРА ІЛЬІНСКАГА, звыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА № 47.

КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

даводзіць да ведама падпісчыкаў,

што наступныя нумары лётарэйных білетаў

ня будуць прымаць удзел у розыгрышу лётарэі

15 студзеня 1929 году

З ПРАЧЫНЫ АДМОВЫ АД ЗРОБЛЕНАЙ ПАДПІСКІ

НУМАРЫ БІЛЕТАЎ:

240, 241, 242, 243, 244, 245, 246, 247, 248, 249, 250, 251, 252, 253, 254, 255, 256, 257, 258, 259, 260, 261, 262, 263, 264, 265, 266, 267, 268, 269, 270, 271, 272, 273, 274, 275, 276, 277, 278, 279, 280, 281, 282, 283, 284, 285, 286, 287, 288, 289, 128, 126 114, 127, 130, 1, 1101, 2593, 2595, 2589, 2250, 2332, 2366, 4220.

РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ І ПАСТУПІЎ У ПРОДАЖ

№ 12 „МАЛАДНЯК" № 12

ШТОМЕСЯЧНЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ І ГРАМАДЗКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС — ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ПРАЛЕТ. ПІСЬМЕНЬНІКАЎ. —

Шосты год выданьня. Шосты год выданьня.

ЗЬМЕСТ:

Дэкларацыя зьезду БелАПП: П. ТРУС—«Дзесяты падмурак» (паэма); Я. ЛІМАНОЎСКІ—Вецер з Усходу (апав.); В. МАРАКОЎ—Адноўленая зямля (паэма); Р. МУРАШКА—Вінчэсьцер (апав.); Е. ПФЛЯУМБАУМ—Да дзесятых угодкаў (верш); Ід. БАРАШКА—Юбілейная казка; Я. БОБРЫК—Паэма—Беларусь; І. ПЛАЎНІК—Савецкай Беларусі (верш); М. ЗАРЭЦКІ—Белыя руны (драма); А. ЗВОНАК—Загай (паэма); М. КАСЬПЯРОВІЧ—Беларуская культура да 10-годзьдзя БССР; С. ЗАМБРЖЫЦКІ—Творчасьць Ц. Гартнага, У. Ф.—Рэйзін; ХРОНІКА

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1929 ГОД.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: НА ГОД . . 3 Р. 00 К. НА 6 М-ЦАЎ . . 1 Р. 60 К. НА 3 М-ЦЫ . . 0 Р. 90 К.

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ—40 КАП.

Горацкая с.-г. дасьледчая станцыя

абвяшчае КОНКУРС

НА ЗАМЯШЧЭНЬНЕ ПАСАДЫ АСЫСТЭНТА ПА ДАСЬЛЕДЧАМУ АДДЗЕЛУ САДОЎНІЦТВА З 1-га ЛЮТАГА 1929 Г.

Пакідаюцца на месцы 3 хгадовага стажу па плодаўніцтву ва ўмовах БССР. Ад кандыдата патрабуецца вышэйшая адукацыя і па магчымасьці дасьледная праца ў плодаўніцтве.

Аплата 100 рублёў у месяц.

Заявы накіроўваць у Горы-Горкі, Аршанскае акругі, Дырэктару Горацкай дасьледчай станцыі.

Галоўлітбел 595. Менск, дзяржаўная друкарня

Усебеларуская краязнаўчая канфэрэнцыя.

Укладаньне геаграфічнага слоўніка раёну.

(ДАКЛАД А. КРУКОЎСКАГА).

Да апошняга часу краязнаўчыя арганізацыі, усе ўстановы і асобы, якія ставяць сваёю мэтаю геаграфічнае вывучэньне сваёй мясцовасьці, сустракаюцца з фактам няведаньня падлягаючых вывучэньню аб'ектаў; гэта вельмі абцяжарвае працу, патрабуючы часта вялікае затраты часу і сродкаў толькі на адно адшуканьне самых аб'ектаў вывучэньня. Гэта ўсё кажа за неабходнасьць выданьня такое кніжкі, якая дала-б больш-менш поўны пярэлік тых геаграфічных аб'ектаў, якія ёсьць у раёне. Такою кніжкаю можа быць геаграфічны слоўнік раёну.

Добра ўкладзены геаграфічны слоўнік раёну зьявіцца ня толькі патрэбнай кніжкай для краязнаўчых арганізацый, але і настольнай даведчай кнігай для ўсіх установ. Слоўнік зьявіцца даведчай кнігай і для экскурсій, якія значна цяпер пашыраюцца. Школам раённы геаграфічны слоўнік дасьць багаты матар'ял для комплексаў.

Арганізаваньне раённага музэю.

(ДАКЛАД Т. СТ